Залатыя рукі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

БЫЛІ З НАМІ ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2501) Год XLIX | Беласток, 18 красавіка 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Я зразумеў, што ЗБМ можа даць мне тое, чаго чакаю, і што я сам магу нешта даць ЗБМу...

У шоку... на плюс!

Інтэрв'ю з Міхасём СЦЕПАНЮКОМ, новым шэфам Звязу беларускай моладзі (ЗБМ):

Ніва: — Ці будуць у ЗБМ змены?

— Думаю, што асновай далей будзе „Бардаўская восень" і рэйд „Сцяна", і, я, як новы старшыня, хацеў бы пакарыстацца тут дапамогай і вопытам старэйшых сяброў. Ёсць ідэя, каб супрацоўнічаць з БАСам і Брацтвам праваслаўнай моладзі, арганізаваць турніры і мерапрыемствы для ліцэістаў і гімназістаў. Думаем таксама пра партнёрскія праекты з беларускай моладдзю, напрыклад, у Літве.

— Дагэтуль ЗБМ успрымаўся як мужчынская арганізацыя. Ці зараз, з-за твайго старшынства, будзе шанц падзейнічаць і дзяўчатам?

— Няма ніякіх перашкод. Адна дзяўчына ўжо нават прынесла дэкларацыю.

— У якім стане ты пераняў арганізацыю?

— Я быў у шоку... на плюс.

Проста, кожны, хто мае ў нас сваю ролю, выконвае яе як найлепш. У нас няма такога беларускага хаосу, у негатыўным сэнсе — што калі хочаш нешта зрабіць, трэба з трыццаццю асобамі пасварыцца. Наша арганізацыя сяброўская і самі сабе не мяшаем.

— Адкуль тады шок?

— Яшчэ ў пачатковай школе я трымаўся на значнай адлегласці ад гэтай арганізацыі і не хацеў пра яе слухаць. Мой погляд на ЗБМ пачаў мяняцца ў другім класе ліцэя.

— Што такое здарылася?

— Паўплывала на гэта сустрэча з Ігарам Лукашуком, які, як студэнт беларусістыкі, праходзіў у нашым ліцэі настаўніцкую практыку. Ён, як тадышні старшыня ЗБМ, шукаў кантакту з Клубам польска-беларускіх спраў, якім я кіраваў. Адначасова ўмеў зацікавіць нас сваёй арганізацыяй.

Пасля, разам з Томкам Сулімам і Чаркам Хіліманюком, мы дапамагалі ў арганізацыі „Бардаўсай восені". Расклейвалі па горадзе плакаты, дапамагалі ў час канцэрта. Усе тыя дзеянні паказалі, што мы камунікуем на адных хвалях. Я зразумеў, што ЗБМ можа даць мне тое, чаго чакаю, і што я сам магу нешта даць ЗБМу.

— Менавіта, што дасі арганізацыі?

— Зараз добры час для нашай суполкі. У нас многа новых актыўных сяброў. Напрыклад, у рэйдзе „Сцяна" ўдзельнічала 25 асоб, а праз цэлы рэйд правінулася недзе пад 40 чалавек. Такога не было ад даўжэйшага часу.

З другога боку ў нас канкрэтныя прапановы для моладзі з гарадоў, мястэчак і вёсак.

— Напрыклад?

— Турніры, спаборніцтвы, рэйды, мерапрыемствы для нас саміх і для іншых беларусаў.

— Значыць, будзе супрацоўніцтва?

— Гэта ўжо было раней, калі ЗБМ наладзіў кантакты з Беларускім клубам у Бельскім ліцэі. Цяпер у нас добрыя кантакты з БАСам. Я, напрыклад, жыву разам са старшынёй БАСу і не наракаю. І думаю, што яна таксама не наракае.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Міхась Сцепанюк верыць у актыўнасць беларускай моладзі

САМ ПРА СЯБЕ: Нарадзіўся я 25 студзеня 1984 года ў Бельску-Падляшскім. На пачатку быў праваслаўным палякам, сварыўся з дзядулямі, каб не гаварылі да мяне па-свойму. У трэцім класе пачатковай школы захапіўся ўрокамі беларускай мовы, якія вяла Валянціна Бабулевіч. Год пазней перайшоў у рукі Сустрэч „Зоркі", і, шчыра кажучы, усё што пераняў ад Сустрэч, з гэтым згодны і ў тое веру. Другім важным для фарміравання маёй нацыянальнай свядомасці быў гурток Дарафея Фіёніка.

Зараз я студэнт Варшаўскага універсітэта. Займаюся на Міжфакультатыўных індывідуальных гуманітарных студыях. Вывучаю іберыстыку і грамадскія навукі.

Зацікаўленні — журналістыка. У адрозненні ад большасці беларусаў — не спяваю...

Праўда фэбнага экрана ☞ 2

Мікола ВАЎРАНЮК

Абедзьве дамы свае палымяныя выступленні завяршаюць Лепэраўскай мантрай, у якой замест прозвішча старшыні Нацыянальнага банка Польшчы паўтараецца прозвішча кіраўніка праграм нацыянальных меншасцей Беластоцкага тэлебачання: „Далоў Каліну!"

Сярод найлепшых ☞ 4

Міхал МІНЦЭВІЧ

У мінулым значную ролю ў развіцці спорту адыгралі настаўнікі фізкультуры: Васіль Ляшчынскі ў Моры і Раман Лудзь у Орлі. Аб арлянскіх спартсменах, а дакладней — футбалістах, добра вядома і сёння. Актыўна дзейнічае футбольная каманда GKP (Gminny Klub Piłkarski) Орля, дзякуючы, у галоўнай меры, Сцяпану ЛУШЧУ з Кашалёў...

Бюджэт Чаромхі ☞ 5

Уладзімір СІДАРУК

Бюджэт гміны складае на баку прыбыткаў 5 250 тысяч зл., а на баку выдаткаў 5 699 860 зл. Нястача галоўным чынам будзе пакрыта крэдытам. На культуру, асвету і выхаванне прызначаецца 36,5% усяго бюджэту, на гмінныя інвестыцыі 17,9%...

Кабарэ ў вярхах ☞ 5

Юстын ПРАКАПОВІЧ

Сакавік прынёс нам новыя дзеі на нашай уладнай сцэне. У свой час адзін з галоўных акцёраў павучаў, што сапраўднага мужчыну пазнаем паводле таго, як ён канчае свой акт, але гэты акцёр загадзя пакідае сцэну, у палове дзеі...

Ізноў па-за саборам ☞ 8

Аляксандр МАКСІМЮК

Фактычна, сёлетні XXIII выпуск Фестывалю, як і два папярэднія, адбываецца па-за Саборам св. Тройцы. Кандыцыя мерапрыемства, з якога боку да яго ні прыглядацца — уласцівая. У Фестывалю адпаведны мерытарычны ўзровень, вялікая зацікаўленасць хораў, гісторыя, традыцыя ды адпаведныя напрацоўкі і дасягненні, якія з гэтай традыцыі вынікаюць...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

На зялёным кантыненце спартоваму свету адкрыла свой талент беларуска Яніна Карольчык. У апошняй шостай спробе Карольчык літаральна вырвала залаты медаль у суперніц — 20 метраў 56 сантыметраў (на той час новы рэкорд Беларусі). Статная дзяўчына з вёскі Хрышчонавічы Свіслацкага раёна адразу трапіла на вокладкі папулярных часопісаў...

9 770546 196000

Праўда срэбнага экрана

Чаго не было ў тэлевізары, таго наогул не было, — паўтарае гераіня амерыканскага фільма і па трупах лезе на экран правінцыйнага тэлебачання ў адным з задрыпаных гарадкоў сярэдняга захаду Злучаных Штатаў Амерыкі. Там яе кар'ера — на заказах прагнозы надвор'я для фермераў — і канчаецца.

Мне, працаўніку падобнага правінцыйнага асяродка Польскага тэлебачання ў Беластоку, такія погляды, асабліва, калі выказваюць іх гледачы — як мёд на сэрца. Чалавека заўсёды прыемна казычуць словы прызнання таго, што ён робіць і важнасці месца, у якім знаходзіцца. Адчуванне значнасці сваёй ролі ў жыцці, хай сабе ўсяго пяці гмін, прыдае сэнс працы. Чалавеку вырастаюць крылы.

З другога боку, аднак, варта памятаць пра лёс Ікара і на тых крылах не надта разганяцца. На шчасце, ёсць людзі, якія не дазваляюць тэлевізійшчыкам занадта ўбіцца ў пыху, сочаць за промахамі і недасканаласцю працы журналістаў і цягнуць іх за ногі з паднебнай высі проста на зямлю.

Такую ролю ў выпадку праграм нацыянальных меншасцей Беластоцкага тэлебачання павінна выконваць Кансультацыйная рада, у якую сваіх прадстаўнікоў накіроўваюць меншасныя арганізацыі Падляшша. У тэорыі. Практыка, як часта ў нас, крыху іншая.

Раду, разам з серыяй меншасных праграм — маўляў, на Падляшшы не адны беларусы, але сапраўдны нацыянальны фальварак — прыдумала першае кіраўніцтва Беластоцкага тэлебачання. Усе яе сябры, якія шануюць сябе і свой час, даўно перасталі прыходзіць на гэтыя зборы. Але пляц бою не апусцеў. Запаўняюць яго дзве бойкія жанчыны: Галіна Раманчук і Валянціна Ласкевіч. Абедзве годна рэпрэзентуюць „свае асяроддзі": Расійскае культурна-асветнае таварыства і народныя масы Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Пані Раманчук можа бясконца гаварыць пра крыўды „выдаўца нашых праграм", у прыватнасці свайго сына Андрэя. Пані Ласкевіч на высокай ноце выказвае абурэнне „нашых людзей неаб'ектыўнасцю беларускамоўных перадач у адносінах да БГКТ". Абедзве дамы свае палымяныя выступленні завяршаюць Лепэраўскай мантрай, у якой замест прозвішча старшыні Нацыянальнага банка Польшчы паўтараецца прозвішча кіраўніка праграм нацыянальных меншасцей Беластоцкага тэлебачання: „Далоў Каліну!"

Галіна Раманчук абвінавачвае Юрыя Каліну ў дыскрымінацыі расіян на Беласточчыне. Валянціна Ласкевіч ягоных грахоў можа пералічыць больш: не прыходзіць на сходы Беларускага таварыства, не слухае крытыкі народу, замала паказвае фэстаў, не любіць прэзідэнта Лукашэнку... На сходзе Кансультацыйнай рады 23 сакавіка абуралася: „Што гэта за сцяг паяўляецца ў пачатку праграмы «Беларускі тыдзень»?" Калі хто з чытачоў не бачыў або забыўся, то нагадваю: бел-чырвона-белы. Такі сам, якім Беларускае грамадска-культурнае таварыства аздабляла свае мерапрыемствы на Беласточчыне ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. У эпоху, якую яшчэ не адмервалі гадзіннікі-ўзнагароды ад Аляксандра Рыгоравіча.

Агнястрэльную крытыку дзвюх заслужаных дзяячак можна звесці да аднаго: не тых што трэба паказваеце! Ці яны баяцца, што калі знікнуць са срэбнага экрана, дык наогул расплывуцца ў нірване? Галіна Раманчук рэзка гэтаму супраціўляецца і сваёй асобай упрыгожвае кожны выпуск праграмы „Рускі голас". Валянціна Ласкевіч больш сціплая. Яна, як сапраўдная народная заступніца, ніколі не гаворыць ад свайго імя, а заўсёды ад „абураных грамадскіх масаў", таму карыстаецца формай „мы". Дык калі баіцца за Беларускае грамадска-культурнае таварыства, магу яе супакоіць. Я, як чалавек, які мае непасрэдны ўплыў на змест і форму беларускіх тэлеперадач у Беластоку, падлічыў, колькі мерапрыемстваў БГКТ мы здымалі ў апошніх двух гадах. Выйшла, што больш чым у кожнай другой праграме. Знікненне арганізацыі не пагражае!

Мікола Ваўранюк

PS. Д-р Лена Глагоўская два разы — у „Ніве" і „Часопісе" — выказвае жаль, што на ўшанаванні памяці Язэпа Найдзюка ў Інавроцлаве не было беларускіх электронных сродкаў масавай інфармацыі з Беластока. Дарагая д-р Лена, няма такіх СМІ. Ёсць Польскае тэлебачанне і Польскае радыё. Было беларускае радыё „Рацыя". Было, але сплыло!

Свая дзяржава

Нацыянальная дзяржава — утварэнне натуральнае. Да яе ўзнікнення вяло жаданне этнічна блізкіх людзей захаваць сваю тоеснасць і, паводле сваіх поглядаў на свет, адрэгуляваць дачыненні між сабой: стварыць справядлівыя права і суд, сістэму бяспекі і сацыяльную абароненасць (у нашым сённяшнім разуменні). У падмурках будавання нацыянальнай дзяржавы ляжыць памкненне да справядлівасці стасункаў жыхароў, а таксама жаданне захаваць свае непаўторныя адметнасці. Развіццё такога дзяржаўнага ўтварэння ў ідэале — гэта дасканаленне свайго права, як элементу справядлівасці, а таксама добрых дачыненняў з суседзямі, як элементу бяспекі.

Не ўсё атрымвалася адразу. Гэты працэс прайшоў праз рэчышча цяжкіх спробаў і жудасных памылак. Кіраўнікі краін, каб захаваць памежную бяспеку, нават ахвяравалі сваімі дзецьмі, прыкладам — шлюбы дзеля міру. Ламаліся чалавечыя лёсы, аслаблялася сваяцкая повязь, бо такія шлюбы яшчэ не давалі поўнай гарантыі і не заўсёды маглі прадухіліць вайну. Ставалася і так, што бацька і дачка назаўсёды падзяляліся крывавымі войнамі паміж іх краінамі. Але падобная самаахвярнасць дзеля захавання міру паўтаралася зноў і зноў. Нацыянальныя дзяржавы спарадзілі новую, вялікую ў гісторыі чалавецтва з'яву — адказнасць кіраўніка краіны за лёс свайго народа. З цягам часу гэтая адказнасць лягла на плечы цэлага класа, які лічыўся элітай і меў уладу. А пасля, з пашырэннем удзелу ў дзяржаўным будаванні ўсё большых колаў грамадства, адказнасць за лёс сваёй краіны стала ўсенароднай з'явай. Нацыянальная дзяржава, дзеля захавання тоеснасці і адметнасці свайго народа, дзеля пабудовы справядлівага грамадства і развіцця яго культурных, духоўных і нацыянальных каштоўнасцей, спарадзіла тры сама важныя з'явы: інстытуты дзяржаўнай справядлівасці, сістэму дзяржаўнай бяспекі і, галоўнае — грамадзянскую адказнасць кожнага за лёс сваёй краіны і наступныя пакаленні. Такія рэчы спрыяюць выхаванню адказнага, духоўнага і інтэлігентнага чалавека.

Зусім у іншым рэчышчы ідзе развіццё імперыі. Імперыі — утварэнні ненацыянальныя і, як наступства, антынацыянальныя. Такія дзяржаўныя ўтварэнні не лічацца з жаданнямі не толькі паняволеных народаў, але і свайго. Яны, дзеля злачынных мэтаў, пасылаюць на смерць сваіх жа грамадзян, дакляруючы поўную безадказнасць і абыякавасць да іх лёсу. Калі нацыянальнае дзяржаўнае ўтварэнне базуецца найперш на духоўных каштоўнасцях свайго народа, то ненацыянальнае — на матэрыяльных інтарэсах і імперскіх амбіцыях. Новыя землі, рынкі, прыродныя багацці, дамінуючае месца ў свеце — вось няпоўны пералік прыярытэтаў такой дзяржавы. Кіруе ёй не грамадства, а пануючы клас, які мае поўную ўладу і нічым не рызыкуе. Яна не ахвяруе сваймі дзецьмі дзеля міру. Наадварот, іх дзеці маюць такія ж прывілеі, як і бацькі. У войнах праліваюць кроў іншыя. А для гэтага іншых трэба выхоўваць у духу шавінізму, фашызму, у духу нянавісці да іншых народаў і сваёй перавагі над імі. На гэтым базуецца сістэма выхавання „каштоўнасцей" чалавека ў ненацыянальных дзяржаўных утварэннях.

На шчасце, гісторыя таму сведка, на тэрыторыі імперыі рана ці позна зноў паўстаюць нацыянальныя дзяржавы. Нішто не можа знішчыць натуральны лагічны працэс развіцця чалавецтва. Яго можна толькі запаволіць, перарваць на нейкі час, але не адолець. Ніякія казкі пра „светлую будучыню" безнацыянальнага быцця, ні „абдорванне" чалавека безліччу такіх „правоў", якія вышэй права яго нацыі і нават не лічацца з Божымі павучаннямі, не змогуць перарваць ланцуг пакаленняў. Бо калі правы чалавека, які працуе чыноўнікам, па-за межамі разумення права яго нацыі, то справядлівага развязання якой-кольвек праблемы ад яго чакаць не даводзіцца. Не кожны чалавек хоча ахвяраваць сабой дзеля таго, што яго не тычыць. Не кожнаму трэба апекавацца нямоглымі, хворымі ці старымі. Але нацыя, як цэласць, заўсёды ганарыцца справядлівасцю, ахвярнасцю і выхоўвае суайчыннікаў паводле лепшых традыцый.

Ніякія наднацыянальныя дзяржаўныя ўтварэнні не змогуць быць вечна. Яны пазбаўлены трывалай грунтоўнай ідэалогіі. Бо такой не бывае. Толькі нацыянальныя краіны могуць абараніць свае правы, захаваць тоеснасць і адметнасць кожнага народа, стварыць спрыяльныя ўмовы для духоўнага развіцця сваіх грамадзян, усталяваць на Зямлі мір і дабрабыт, выхоўваць адказных зычлівых людзей.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Вачыма еўрапейца

Залежныя палітыкі

Чамусьці няма ў мяне даверу да палітыкаў, якія мяняюць сваю палітычную афарбоўку, нават калі тыя партыі набліжаныя да сябе па светапогляде. Да нядаўна яшчэ мне здавалася, што лаяльнасць у адносінах да групоўкі наказвае вытрымаць з ёю найцяжэйшыя хвіліны, а нават кануць з ёю ў нябыт, прынамсі на час перадумання памылак (хоць на час чытырохгадовага парламенцкага перыяду). У апошні час, аднак, асабліва шмат намножылася асоб урабляючых палітыку, якія рушылі на партыйную вандроўку. Несумненна, робіцца гэта з-за набліжаючыхся хуткім крокам парламенцкіх выбараў, якія будуць аб'яўлены, можа быць, яшчэ на сёлетнюю восень, можа, на вясну наступнага года. Для шмат каго з іх за гэтай вандроўкай стаіць надзея застацца ў колах улады і ўплываў, быццам папрывыкалі яны да іх, як да якое марыхуаны.

— Без мяне ж дзяржава не справіцца! — здаюцца мройліва меркаваць залежныя партыйныя вандроўнікі.

Пад відам заснавання левай партыі людзей з чыстымі рукамі аддзялілася ад СЛД Польская сацыял-дэмакратыя (СдП). Дарэчы, варта прыгадаць, што паняцце „чыстыя рукі" ўвёў былы міністр справядлівасці, пасля прэм'ер, сёння міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, прыватна жыхар Белавежскай пушчы. СдП жа сёння не прадставіла ніякай праграмы, а членаў згуртавала індывідуальнасць яе правадыра Марка Бароўскага, дагэтуль маршалка Сейма, і супраціў у адносінах да пагружанага ў афёрах СЛД. На лакальным падляшскім рынку ў СдП перайшла Барбара Цірук. У час ейнай дэпутацкай дзейнасці да гэтага часу найгучней было аб ёй у сувязі з няясным удзелам у працах над навелізацыяй закона аб радыёвяшчанні і тэлебачанні, што стала прычынай разгулу г.зв. афёры Рывіна, найбольш балючага ўдару ў гэтай кадэнцыі для СЛД. Знюхаў справу адразу іншы мясцовы палітык, віцэ-старшыня беластоцкай Гарадской рады Кшыштаф Біль-Ярузельскі. Вандроўка гэтага ледзь саракагадовага палітыка — вартая апісання быццам падарожжы Хрыстафора Калумба. Пачынаў, калі добра памятаю, у ППС, калі гэтая партыя мела ў парламенце сваіх прадстаўнікоў (такіх, як, напрыклад, беластоцкі сенатар Ян Муляк). У час першай, някепскай кан'юнктуры, перайшоў ён ва Унію працы. Калі аказалася, што УП мае страты, трапіў „у пару" ў СЛД. Узначаліў нават беластоцкія структуры Саюза, але беспаспяхова меціў сесці ў крэсла старшыні ваяводскіх. Цяпер апынуўся ў партыі Марка Бароўскага.

Не ўспомню ўжо аб нядаўніх вандроўках цалюткіх фармацый ці іх немалых падгрупоўках. На гэтым прынцыпе ўзнікла некалькі партый, якія пасля адыгрывалі істотную ролю. Дзякуючы гэтаму функцыянуюць у парламенце Грамадзянская платформа (PO), Права і справядлівасць (PiS) ці Ліга польскіх сем'яў (LPR). Але гэта, мабыць, палітычна нармальнае. Гэта рэакцыя на грамадскія адчуцці, задавальненне ці неадабрэнне электарата ды на несправядлівыя механізмы дзейнічання дзяржавы. Але з пункту гледжання еўрапейца, тае стабільнай, палітычна ўнармаванай часткі Еўропы, для большасці нашых вандроўцаў не было б там месца. Шмат іх вандруе, як казала мая бабуля, „куды залапоча сцяг". Электарат у Еўропе бязлітасна патрактаваў бы іх як здраднікаў ідэй, якія самі яны дакляравалі. Выплюнуў бы іх на абочыну і на нішто не здаліся б нават новаствораныя ў тым часе партыйныя шыльды. У Еўропе, не ў Польшчы.

Рэната Бегер вандроўных палітыкаў назвала „палітычным планктонам". Ці не прыжывецца гэта ў еўрапейскай мове?

Мацей Халадоўскі

Залатыя рукі з Залатнікоў

У Залатнікі, што за Юхнаўцом, падбухторвала мяне цікавасць. З боку шашы, што з Беластока ў напрамку Страблі, візіткай вёскі каплічка з праваслаўным крыжам, як астравок паміж касцёламі ў Трычоўцы і Юхнаўцы...

Іду па абледзянелай вуліцы, разглядаюся. За час, пакуль прайшоў праз усю вёску, мінула мяне адна легкавушка і здалёк ад вуліцы мігнулі два мужчыны. Слядоў на панадворкі мала, хаця хаты выглядаюць задбана, абабітыя шалёўкай або сайдынгам, але з мала каторай высоўваецца на мароз дым. За вёскай змарожанае поле, за якім лес. Вяртаюся зноў на прыкрыты снегам лёд вуліцы. Прыглядаюся абабітай шалёўкай хаце, але не шалёўцы, толькі прыгожа выразанаму навугольніку. На панадворку пажылы чалавек пхае тачку. Іду далей, аглядаюся. Чалавек з тачкай перасякае вуліцу і дапытліва глядзіць у мой бок. Вяртаюся, вітаюся.

— Скажыце, — пытаю, — хто гэта выразаў вам такія навугольнікі?

— А ён і сам недалёка жыве, — адказвае мне ўладальнік тачкі, на якой вязе пусты і крыху паднішчаны кошык. — Вось там, тры слупы адсюль; ягоная хата таксама абабіта навугольнікамі.

Заходжу залішне не разглядаючыся на паказаны мне панадворак і ўсумняваюся, як увайсці ў хату. Бетонная дарожка перад парогам падмецена, але следу на ёй не відаць...

У хаце пара пажыленькіх гаспадароў. Прадстаўляюся.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Уладзіслаў Клімчук у майстэрні з узорамі для скразной разьбы

— То вы ад Чыквіна будзеце? — цікавяцца.

Я дакладней устанавіў свае каардынаты і пачуў:

— А нас раней наведала з „Рацыі", Валя называлася...

І так, слова за словам, знаёміліся. Вырас я з патрыярхальнага грамадства ды так менавіта і размова склалася, што гаспадыні, адзінай там разынцы наогул гаварлівага жаночага роду, давялося ў прынцыпе прыслухоўвацца. Дарэчы, цікавіла мяне абліцоўка хаты, а гэта мужчынская справа.

Уладзіславу Клімчуку восемдзесят гадоў. Узрост сур'ёзны...

— Што вы помніце з наймалодшых гадоў? — пытаю.

— Быў конь, карова. І была Польшча сярмяжнікаў і жабракоў. Панам было добра і тым што ўлады трымаліся — так як і цяпер. Маім абавязкам было карову пасвіць, басанож. А ўзімку была адна пара ботаў на дваіх.

— Даводзілася вам сумяшчаць пастушкаванне з вучобай.

— Нядоўга, бо ў школу хадзіў толькі чатыры гады. А пасвіць трэба было з 1935 года, пасля камасацыі, бо раней вёска наймала пастухоў. У бацькоў я быў наймалодшы, таму мяне застаўлялі кароў пасвіць. І здавалася мне, што няма горшага занятку! Аднойчы, у нядзелю гэта было, мне так спрацівіліся тыя каровы, што прыгнаў дахаты і сказаў: „Досыць!" І больш ужо не пасвіў...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Капліца і крыжы ў Залатніках

У хату спадарства Клімчукоў зайшоў на выгляд саракагадовы мужчына.

— Пойдзем дошкі рэзаць? — спытаў гаспадара.

— Цяпер не.

— То за які час?

— Пакуль будзе ляжаць снег, не пайду.

* * *

Госць выйшаў, а я зноў вяртаю гаспадара да апавядання:

— Як вы сталі займацца апрацоўкай драўніны?

— Мяне гэта цікавіла і з наймалодшых гадоў любіў я вельмі стругаць. У ніякую сталярскую школу я не хадзіў, адно толькі ўважліва прыглядаўся, як іншыя абрабляюць драўніну. У вайну я амаль два з паловай гады працаваў за Беластокам, пад Каралёвым Мостам, Жэдняй, пры высечцы лесу. Трэба было высечы лес па сто метраў з абодвух бакоў шашы і чыгункі ў Ваўкавыск, каб партызанам адняць магчымасць падыходзіць і ўзрываць дарогі. Каго вывезлі ў Германію, таму кампенсацыю даюць цяпер. І ў Сібір каго вывезлі, той на сябе там працаваў; усюды дрэнна было. А я начаваў па стадолах і накрываўся тым, што на сабе меў, на Рэйх працаваў, здароўя колькі патраціў, а кампенсацыі за гэта няма...

Як адыходзіў фронт, каля Залатнікоў былі баі, ад абстрэлу снарадамі было разбіта шмат будынкаў. Трэба было адбудоўваць вёску. Спачатку хлявы, клуні, свірны стаўляў. І ўсё трэба было рукамі вырабіць: свердзелам, рубанком, стругам, пілой, сякерай — машын тады не было. У 1955 годзе пабудавалі мы разам з жонкай хату — яна мне дапамагала бярвенне класці, бо не было грошай каб якога мужчыну наняць. І печ сваю сам паставіў — пры ёй ужо я і дажыву...

І ўжо пасля стаў я стаўляць і іншым хаты: у Залатніках, Белях, Клявінаве, Баранках — разам семнаццаць драўняных хат паставіў! У 1953 годзе Залатнікі пацярпелі ад пажару, працы многа было.

Калі не было фундамента, сам заліваў. Да працы наймаў памочніка. Дылю трэба было дапасаваць, вугал выразаць дакладна, каб вецер пасля не прадуваў, падлажыць мох, змацаваць тэблямі. І так дыля за дыляй, аж да самога верху. Пасля кроквы і латы, і чарапіца цэментная або выпаленая з гліны.

— Саломай не крылі?

— Маіх дамоў саламянай страхой не крылі, а ў каго такая была, таму бясплатна давалі бляху для перакрыцця.

— А квадратных, тонкіх чарапіц, не было?

— Да вайны не было. Такою чарапіцай саветы ў 1940 годзе накрылі баракі для войска, якія паставілі пад Беластокам, насупраць цяперашніх казармаў, дзе Кавалерыйская вуліца разгаліноўваецца на дарогі ў Юхнавец і Лапы. Там у 1941 годзе немцы трымалі савецкіх палонных, а адступаючы ў 1944 годзе тыя баракі спалілі.

* * *

І падлогі я сам клаў, — прадаўжае спадар Клімчук, — і столі, вокны і дзверы вырабляў і ўстаўляў. У 1951 годзе стаў на працу ў сталярню ў Беласток: вокны, што на рагу Сянкевіча і Рынку Касцюшкі, гэта мая работа. Той мужчына, што заходзіў, хацеў шалёўку вырэзваць для нашага пажарнага дэпо, якое я накрыў.

— Яно за крамай стаіць?

— Так. А будынак крамы я прывёз з Росталтаў. Там была гэсаўская крама, якую ў 1984 годзе перавялі ў школьны будынак. І тая крама акурат падыходзіла да падмурка, што ў нашай вёсцы пасля свірана астаўся. Прыгожую краму маем цяпер. І хаты пенсіянеры паднаўлялі. Але людзей мала ў вёсцы засталося, найчасцей па адной жанчыне ў хаце, нас яшчэ двое.

— А што вы можаце сказаць пра каплічку, што на канцы вёскі: калі яе пабудавалі?

— Гэтага я не ведаю. Адпраўляецца каля яе набажэнства ў першую суботу пасля Пяцідзесятніцы. Калісь град збожжа пабіў і людзі заклалі такое свята. Сама капліца яшчэ пры цары пабудавана і з таго часу ніякая сталярка там, мабыць, не абнаўлялася, мо толькі дах перакрылі. Я туды адно той вялікі крыж зрабіў на Тысячагоддзе хрышчэння Русі.

— Можа яшчэ крыху пра вашы навугольнікі... — прашу.

Спадар Клімчук прыносіць здымкі свае хаты. Толькі цяпер заўважаю, бо на марозным двары не задзіраў уверх галавы, што не толькі навугольнікі і вокны ўпрыгожаны дакладна дапрацаванай разьбой. З захапленнем гляджу на ажурны вільчык, звенчаны двума байкаватымі львамі!

— Не меў я добрага ўзору, — тлумачыцца перада мною, — таму і львы такія атрымаліся...

Паволі канчаем гутарку. Мой суразмоўца дадае:

— Пры Народнай Польшчы я на працягу дваццаці двух гадоў быў зарэгістраваны прыватнікам, цесляром. Быў нават цяслярскім экспертам, бо ў Рамесніцкай палаце іншага цесляра не было. Плаціў толькі ўзносы ў цэх, а падаткаў не, бо быў земляробам і цяслярства лічылася дадатковым заняткам. Аформіў дакументы і адразу працуй! А сёння, калі пачынаеш гаспадарчую дзейнасць, адразу падатак плаці!

Пры Народнай Польшчы маладым лепш было, — заключае спадар Клімчук, — а старым горш, бо пенсій не было. А цяпер наадварот. Усё гэта дзякуючы Герку, бо ён за бедных людзей заступіўся.

Аляксандр Вярбіцкі

Гульні па валейболу

У спартыўнай зале Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы 20 і 21 сакавіка Брацтва праваслаўнай моладзі арганізавала Міжпрыхадскія спартыўныя гульні па валейболу. Прыступіла да іх 30 каманд з Гайнаўскага, Бельскага і Беластоцкага паветаў, у якіх іграла моладзь узростам ад 10 да 35 гадоў.

У фінале сустрэліся каманды з Нараўкі і Гайнаўскага белліцэя. Перамаглі старэйшыя і больш вопытныя ігракі з Нараўкі, якія прадстаўлялі прыход св. Іаана Хрысціцеля. У камандзе з белліцэя выступілі, у асноўным, вучні першых класаў. Трэцяе месца заняла моладзь прыхода ў Дубінах, а чацвёртае — вучні з Нараўкі, якія рэпрэзентавалі мясцовы гурток Брацтва праваслаўнай моладзі.

— Калі маладыя людзі бачаць, што ў брацтве ёсць месца для спорту і адпачынку, больш ахвотна прыходзяць да арганізацыі, — заявіла старшыня гайнаўскага брацкага гуртка, белліцэістка Агнешка Пуц, якая разам з сябрамі займалася арганізаваннем мерапрыемства. Суарганізатарам яго быў Белліцэй, якога настаўнікі фізкультуры памагалі праводзіць матчы.

Аляксей Мароз

Ольштынскае беларусазнаўства

26 сакавіка па ініцыятыве прафесара Валентага Пілата ў Вармінска-Мазурскім універсітэце ў Ольштыне адбыўся ўстаноўчы сход гуртка Польскага беларусазнаўчага таварыства. Старшыня ПБТ прафесар Міхал Саевіч з Люблінскага універсітэта пазнаёміў сабраных з формамі і мэтамі дзейнасці таварыства. Галоўныя мэты, гэта інспіраванне, зладжванне і падтрымка беларусазнаўчых даследаванняў гісторыі, культуры, фальклору, грамадскага жыцця ды культурнай тоеснасці беларусаў з асаблівай увагай да пытанняў польска-беларускага літаратурна-культурнага і моўнага памежжа, а таксама пашыранне ў польскім грамадстве ведаў пра беларускія культуру, гісторыю, літаратуру, мову, фальклор ды сучаснае жыццё беларусаў.

Гурткі ПБТ дзейнічаюць ужо ў Беластоку, Познані, Вроцлаве і Любліне. І ў Ольштыне будзе цікава знаёміцца з вынікамі беларусазнаўчых даследаванняў так замежных, як і польскіх навукоўцаў і дзеячаў.

Андрэй Гаўрылюк

УладыЛЗС у Нараўцы

У Нараўчанскай гміне актыўна дзейнічаюць секцыі футбола, баскетбола, настольнага тэніса ды шахмат ва ўсіх узроставых групах.

У сакавіку г.г. выбралі новае Гміннае праўленне ЛЗС у Нараўцы: Анатоль Бароўскі (старшыня), Міраслаў Місяюк і Андрэй Яворскі (намеснікі старшыні) ды Міраслаў Краснапольскі, Міхал Панфілюк і Андрэй Скепка (члены).

Рэвізійную камісію ўзначаліў Ян Янушкевіч. Яго намеснікам выбралі Аліну Аўрук і членам камісіі Тамаша Барэчку. **(яц)**

Заўсёды сярод найлепшых

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Сцяпан Лушч: На жаль, моладзь цяпер не вельмі горнецца да спорту...

Арлянская гміна можа ганарыцца людзьмі спорту і традыцыямі прапагандавання фізкультуры не толькі ў вясковым асяроддзі. У гонар Аляксандра Войны, які паходзіў з самой Орлі, у Беластоку праводзіцца лёгкаатлетычны мемарыял, а ягоны сын Цэзары некалькі гадоў таму быў адным з мацнейшых у краіне кідальнікаў кап'я. У 90-х гадах выдатных вынікаў у кіданні кап'я дабіўся сярод юніёраў Яраслаў Вітошка з Орлі (пляменнік аўтара). У мінулым значную ролю ў развіцці спорту адыгралі настаўнікі фізкультуры: Васіль Ляшчынскі ў Моры і Раман Лудзь у Орлі. Аб арлянскіх спартсменах, а дакладней — футбалістах, добра вядома і сёння. Актыўна дзейнічае футбольная каманда GKP (Gminny Klub Piłkarski) Орля, дзякуючы, у галоўнай меры, Сцяпану ЛУШЧУ з Кашалёў, які ўжо шмат гадоў займаецца развіццём вясковага спорту.

Футбольная спортпляцоўка ў Кашалях распаложана на пачатку вёскі з боку Орлі побач лесу званага Борам і лічыцца адной з лепшых у ваяводстве. Глядзець матчы мясцовай каманды прыходзіць па сто пяцьдзесят, а нават і па трыста балельшчыкаў з навакольных мясцовасцей. Пляцоўку для футбольных змаганняў пабудавала дваццаць гадоў таму кашалёўская моладзь.

Сцяпан Лушч, 50-гадовы пенсіянер — чалавек скромны. Людзі ведаюць яго ды шануюць і паважаюць за ангажаванасць у прапагандаванне вясковага спорту. Усе ведаюць, што калі б Сцёпка Лушч спыніў дзейнасць, дык футбольная каманда не захавалася б, а пляцоўка для гульняў зарасла б травою.

— Тады па вёсках не было клубаў, а і тэлевізар быў яшчэ рэдкай з'явай, таму моладзь больш цікавілася фізкультурай. Амаль у кожнай вёсцы была футбольная каманда і кожную нядзелю праводзіліся матчы. Свае каманды мелі Орля, Міклашы, Маліннікі, Кашалі. У нас у той час не было спортпляцоўкі і мяч ганялі мы на выгане каля могільніка.

— Як паўстаў наш стадыён? У пачатку 80-х гадоў са Шлёнска вярнуўся мой сябра, аднавясковец Сцяпан Хурса і мы рашылі пабудаваць сапраўдную пляцоўку для футбольных гульняў. Выхадайнічалі адпаведны пляц, а гміна для яго нівеліроўкі накіравала нам бульдозер і іншыя машыны. За справу ўзялася ўся кашалёўская моладзь. У выніку паўстаў стадыён з лаўкамі для публікі і раздзявальняй для спартсменаў. Пляцоўку густа абсадзілі навокал бярозамі і соснамі.

— І пачаў я падбіраць з навакольных вёсак хлопцаў для нашай каманды. Тады найбольш футбалістаў было ў Орлі, Кашалях і Міклашах. Каманда спярша называлася LZS Koszele, з 1989 года SPiUR Orla (мясцовы эскаэр даваў транспарт для выездаў каманды), а ад некалькіх гадоў — GKP Orla.

Наша каманда ўжо чатырнаццаць сезонаў іграе ў класе „Б" (у ваяводстве ў гэтай катэгорыі дзве групы: паўночная і паўднёвая). У мінулым сезоне, 2002/2003, наш калектыў апынуўся на пятым месцы ў ліку чатырнаццаці каманд, за камандамі з Пілік, Міхалова, Янаўшчыны і Пасвентнага. Апрача названых спаборнічалі там яшчэ спартсмены з Браньска, Кляшчэль, Нурца-Станцыі, Шалайнаў, Кнышына, Васількава, Гарадка, Бельска-Падляшскага і Юхнаўца.

— Яшчэ годам раней, у сезоне 2001/2002 арлянская каманда іграла ў класе „А", дзе сярод чатырнаццаці калектываў занялі мы сёмае месца. І далей ігралі б у класе „А", калі б была ў нас маладзёжная каманда — такія цяпер у нас патрабаванні. А маладзёжнай каманды мы не маем. Добра было б, калі б такая каманда арганізавалася пры школе. Чаму так не дзеецца — не ведаю; ці гэта школьная моладзь не любіць ганяцца за мячом, ці няма каму гэтага арганізаваць.

GKP Орля ўвесь час сярод перадавых, — не без гонару і задавальнення падкрэслівае Сцяпан Лушч. Восеньскі раунд у мінулым годзе наша каманда закончыла на чацвёртым месцы са стратай чатырох ачкоў да лідэра. На дванаццаць сыграных матчаў мы прайгралі толькі чатыры і адзін сыгралі ўнічыю. Забілі 39 галоў, а прапусцілі 27. Найлепшымі снайперамі былі Аляксандр Міранчук (11 галоў), Анджэй Цёлэк (9), Кшыштаф Канчарэвіч (7), Пётр Дэнісюк (4) і Аляксандр Стэпанюк (4).

Хто і адкуль прыходзіць у каманду? Наймалодшаму нашаму футбалісту 18 гадоў, а найстарэйшаму 45 — іграе ён паўабаронцам. За нашу каманду выступаюць Славамір Баран, Ігар Кляшчэўскі і Пётр Шыманскі з Орлі, Аляксандр Казакевіч, Аляксандр Міранчук, Аляксандр Стэпанюк і Кшыштаф Стэпанюк з Малінік, Раман Каліна з Кашалёў, Андрэй Сасна з Шарнёў, Тамаш Башун з Новага Беразова ды Анджэй Цёлэк, Пётр Дэнісюк, Пётр Філіманюк, Радаслаў Гаўрысяк, Эміль Кобуз, Кшыштаф Канчарэвіч, Тамаш Лукашук, Анджэй Наказнік (варатар), Міраслаў Аганоўскі, Артур Жменька, Яўген Саўчынскі, Славамір Саўчынскі (прэзас) і Міраслаў Ваўранюк (трэнер) з Бельска-Падляшскага. Да мінулага года, ад пачатку існавання каманды, трэніраваў яе Сцяпан Лушч, які цяпер з'яўляецца кіраўніком GKP Орля і віцэ-прэзасам.

— Займаюся камандай на грамадскіх пачатках і нават сам мыю спартыўныя касцюмы футбалістаў — тады ўвесь камплект строяў у адным месцы, нават калі які спартсмен не даедзе. Выступаем у зялёна-белых або жоўтых майках і чорных трусіках.

У класе „Б" мала хто займаецца трэніроўкай, адно выпадкова ў гімнастычнай зале і перад матчамі, таму што амаль кожны футбаліст недзе працуе.

— Праблемай з'яўляецца адсутнасць адной раздзявальні для спартсменаў. Няма і бягучай вады, якую мушу насіць вёдрамі, каб суддзі і спартсмены маглі памыць рукі. Гміна абяцае, што ў гэтым годзе да футбольнай пляцоўкі пракладзе водаправод.

Калі матч адбываецца ў нас, збіраюцца балельшчыкі не толькі з Кашалёў, але і з цэлага наваколля. Прыязджаюць хлопцы з Парцава, Ракавіч, шмат гледачоў прыязджае з Бельска. А калі іграем выязны матч, тады ў гмінны аўтобус забіраецца з камандай столькі балельшчыкаў, колькі ўлезе. Ёсць і балельшчыкі-ветэраны, якім па семдзесят гадоў, а адзін на неадлеглыя выязныя матчы падарожнічае на сваім веласіпедзе, дзеля гімнастыкі.

— Як бачу будучыню вясковага спорту? Лічу, што сёння футбалісты з малых мясцовасцей могуць спаборнічаць толькі ў класах „А" і „Б", бо ўжо вышэй, у акруговым класе каманды не ўстояць па фінансавых прычынах.

На жаль, моладзь цяпер не вельмі горнецца да спорту, да футбола і не відаць наследнікаў сённяшніх ігракоў, — сумна прызнае нястомны спартыўны вясковы дзеяч Сцяпан Лушч.

Міхал Мінцэвіч

Ёсць бюджэты

Чаромха

10 сакавіка ў Чаромсе адбылася IX сесія Рады гміны прысвечаная гміннаму бюджэту і зменам у складзе Рады ды рэвізійнай камісіі. Над праектам гмінных фінансаў дэпутаты спрачаліся ўжо 19 лютага на VIII сесіі. Дыскусія была бурлівая і эмацыйная, у выніку чаго намеснік старшыні Рады гміны Ева Палькоўская рашылася падаць у адстаўку. Радны Лявон Селях ад імя радных заявіў тады гатоўнасць перадаць сутачныя за ўдзел у пасяджэнні камісіі і сесіі Рады ў наступным месяцы на грамадскія мэты (каб падмацаваць гмінны бюджэт). Зразумела, што адмоўнае рашэнне Рады наконт бюджэту выклікала зацікаўленне мясцовага насельніцтва. Загаварылася аб канфлікце паміж Радай і войтам. Але ўжо на IX сесіі радны Анджэй Янушчык так пракаментаваў спрэчкі: „Ніякага канфлікту не бачым, проста разумеем рэальныя патрэбы ў рэалізацыі гмінных інвестыцый і таму станоўча ставімся за прыняццём прапанаванага бюджэту”.

Паколькі Ева Палькоўская падтрымала рашэнне аб адстаўцы, намеснікам старшыні быў выбраны радны са Ставішчаў Славамір Турык. Адбыліся змены і ў складзе рэвізійнай камісіі.

Рада прыняла план развіцця Чаромхі і вырашыла стаць успамагаючым членам Таварыства „Прыязны транспарт”. У чыгуначных справах гміну ў Таварыстве прадстаўляць будзе старшыня Рады Ян Купрыцюк.

Бюджэт гміны складае на баку прыбыткаў 5 250 тысяч зл., а на баку выдаткаў 5 699 860 зл. Нястача галоўным чынам будзе пакрыта крэдытам. На культуру, асвету і выхаванне прызначаецца 36,5% усяго бюджэту, на гмінныя інвестыцыі 17,9%. Плануецца разбудова каналізацыі і добраўпарадкаванне ачышчальні сцёкаў, асфальтаванне гміннай дарогі ў Беразышчы, распрацоўка дакументацыі на водаправод у Беразышчах, Зубачах і Баброўцы, дарогі па вул. Спартовай, мадэрнізацыя даху школы. Сёлета на дзіцячы садок прызначаецца 200 тыс. зл., на падкормліванне школьнікаў — 26 644 зл., на фізкультуру і спорт — 45 тыс., а на дадаткі да кватэрных — 85 тыс. (1,5% бюджэту).

12 радных стрымалі слова і свае сутачныя перадалі на Пачатковую школу і Гімназію (па 1 450 зл.), ды спартыўны клуб „Калеяж” (1 000 зл.). Радная з вёскі Чаромхі заявіла, што арганізуе святочныя падарункі для найбяднейшых дзетак у сваёй вёсцы. Як бачым, Чаромхаўскія радныя паступілі паводле прынцыпу: „Згода будуе”.

Кляшчэлі

17 сакавіка г.г. адбылася сесія Рады гміны і горада ў Кляшчэлях, на якой аднагалосна быў прыняты бюджэт. Сёлета складае ён суму 4 мільёнаў злотых так на баку прыбыткаў, як і выдаткаў. Вось што сказаў бурмістр Аляксандр Сяліцкі:

— Сёлета не карыстаемся крэдытам адно еўрасаюзнымі сродкамі праграмы PHARE, дзякуючы якім зможам рэалізаваць задуманыя інвестыцыі. З важнейшых можна адзначыць пабудову новага пасёлка з дваццаці жылых дамоў у цэнтры горада па вуліцы Белавежскай і разбудову інфраструктуры на Рэпчыцкім вадасховішчы. Гэта паглыне нам 700 тыс. зл. На каналізацыю прызначылі другое столькі (600 тыс. работы і 100 тыс. — афармленне дакументацыі). Мадэрнізацыя скрыжавання вуліц Каперніка і Паркавай пры краме „Левятан” абыдзецца ў 30 тыс. На культуру (датацыі для ГОК) прызначаецца 120 тыс., Гмінную бібліятэку — 40 тыс., фізкультуру і спорт (разам з купальным басейнам і курортам на Рэпчыцкім вахасховішчы) — 50 тыс. зл. Радныя на сесіі прапанавалі асфальтаваць вуліцу ў Дашах, але разважыўшы справу, пагадзіліся перакінуць рэалізацыю на наступны год (сёлета апрацуецца дакументацыя) ды ў першую чаргу перабудаваць скрыжаванне дарогі ў напрамку Рагачоў. Сёлета рыхтуецца дакументацыя для водаправода ў Белую Страж, а ў наступным годзе будзе праведзена інвестыцыя. Такім чынам апошняя вёска (з пятнаццаці салэцтваў) у гміне атрымае ваду.

Уладзімір Сідарук

Кабарэ ў вярхах

Сакавік прынёс нам новыя дзеі на нашай уладнай сцэне. У свой час адзін з галоўных акцёраў павучаў, што сапраўднага мужчыну пазнаем паводле таго, як ён канчае свой акт, але гэты акцёр загадзя пакідае сцэну, у палове дзеі.

На сцэну выйшаў іншы акцёр, добра ўжо нам вядомы. Памятаем, як пасля выбараў, калі пад шыльдай СЛД-УП да ўлады прыйшлі псеўдалевыя групоўкі, па прапанове прэзідэнта Кваснеўскага міністрам фінансаў быў назначаны прафесар Марэк Бэлька. Ды што ён добрага зрабіў нашай дзяржаве, пенсіянерам? Адно тое, што прыдумаў новыя падаткі: дзеля латання бюджэтнай дзіры быў уведзены дваццаціпрацэнтны налог ад працэнтаў на ашчадныя зберажэнні. Я, напрыклад, у беластоцкім Пэкао завёў рахунак „Superkonto”, на які адкладваю па некалькі злотаў ад пенсіі на г.зв. чорную гадзіну. З гэтага банка штомесяц атрымліваю даведку, колькі грошай знаходзіцца на маім рахунку, колькі прыпісана і які забраны падатак. Ад леташняга верасня да сёлетняга лютага кожны месяц прыпісвалі мне ад 60 да 65 грошаў прыбытку і ад кожнай гэтай вартасці забіралі мне па 20 грошаў падатку. Я пацікавіўся ў дырэктара, чаму забіраюць мне па дваццаць грошаў заміж па дванаццаць або трынаццаць. У адказ пачуў, што гэта згодна распараджэнню міністра фінансаў, паводле якога працэнтны прыбытак ад 55 да 99 грошаў закругліваецца да залатоўкі, ад якой і забіраецца дваццаціпрацэнтны падатак. Сапраўды прафесар Бэлька вельмі заслужыўся ўладам СЛД у абкраданні найбяднейшых грамадзян і ён астаецца галоўным стаўленікам прэзідэнта Кваснеўскага на пасаду кіраўніка ўрада.

Надалей на нашай галоўнай сцэне працягваецца пастаноўка, на якой розныя акцёры іграюць і Лепэра да танцаў запрашаюць.

Юстын Пракаповіч

Дэмакратыя з рылам

Дарога між Беластокам і Бельскам. Рэйсавы аўтобус. Раніца. Гутару праз мабільнік, мой сусед, дзед-пенсіянер, глядзіць на мяне з захапленнем. Першы заводзіць гутарку:

— Шэфова!

— У чым справа?

— Бо я думаю, што Амерыка то ў нас, а не ў Амерыцы.

Спачатку здалося, што дзед стварае канкурэнтны слоўнік для ніўскай рубрыкі „Беластоцкі беларускі слоўнік Бі-бі-сі”.

— Як каму, — кажу.

Мой субяседнік хітра ўсміхнуўся і спадцішка, быццам у канспірацыі, прамовіў: „Вядома каму — для бандзюгаў і зладзеяў!”

Спачатку здалося, што гутарка на гэтым і скончыцца. Усё ж прыемна, калі народ, хай і навыклы да тэлевізара, не адабрае злачыннасці і паталогій.

— А жыдоў ты, шэфова, любіш? — цягнуў тым жа канспірацыйным тонам.

Я адчула, што мой субяседнік, якога я нядаўна паважала за народную мудрасць, цягне на слізкі і вядомы грунт. І што мой погляд і веды яму нецікавыя.

— А ці ты ведаеш, хто Польшчу прасвістаў?

Дзед ведаў найлепш і нават не меў намеру дапусціць каго-небудзь да голасу. І на цэлы аўтобус зароў: ЖЫДЫ І КСЯНДЗЫ! І яшчэ нашы папы падлезлі.

Найбольш дасталася актуальнаму прэм'ер-міністру і прэзідэнту.

— То яны, е... іх м... думалі, што немца згрэбуць пад ногі? Так як Расію? О, не туды дарога! Тут вам не Амерыка! Няма на вас Сталіна! Няма на вас Гітлера!

У пэўны момант мне здалося, што побач мяне сядзіць не просты селянін, а сам лідэр „Самаабароны”. Дзядзька ў нечым змахваў ужо на свайго куміра.

— А ведаеш, хто бацька рымскага папы?

— Ведаю.

— Гаўно ты ведаеш!

Сапраўды, цяжка здагадацца.

Гэты апошні, паводле дзеда — сын генерала ад Балаховіча.

Мне здалося, што задзейнічала нават нейкая медыюмічнасць, я якраз прачытала „Іуду” Уладзіміра Паўлючука і думала пра народны палітычны фальклор.

— То ўсё мяцежнікі-мяцежнікі, — гарлапаніў дзед, — да чаго вы давялі!

У гэты момант наш шафёр востра затармазіў. Каля яго галавы гойдаўся значок з выявай рымскага папы.

— Ужо вы дагуляліся, — крычаў з нейкай асалодай дзед, — цяпер ніхто вам не дапаможа!

Палітычны светапогляд фаната не быў для мяне адкрыццём, адкрыццём была яго агрэсіўная ўпэўненасць і спагада большасці пасажыраў, якія на знак згоды ківалі галовамі.

Дасталася таксама і „Ніве” — бо ў ёй, — казаў дзед-лепэрыст: — е одзён, што то Лукашэнку хоча скінуць.

— Я вас усіх добра ведаю, — дадаў з пагрозай.

(гак)

Гурток ПСН

Актыўна працуе праўленне гуртка Польскага саюза невідучых (ПСН) у Гайнаўцы па вул. Ю. Пілсудскага, 10 А. Яно дапамагае цікава праводзіць свабодны час усім сваім членам. Летам у святочныя дні ездзілі аўтобусам на лясную палянку на беразе сажалак у Тапіле (вёска ў Белавежскай пушчы). Тут бяседавалі за столікамі ў цяньку пушчанскіх дрэў ды танцавалі пад гукі гармоніка.

У лютым г.г. арганізавалі катанне па Белавежскай пушчы для ахвотных з Гайнаўкі і Бельска-Падляшскага. Невідучыя з апекунамі-праваднікамі ездзілі фурманкамі ў лес каля вёскі Ліпіны. Тут на палянцы расклалі агонь і ласаваліся падсмажанымі каўбаскамі. Усе прыемна правялі час.

Праўленне гайнаўскага гуртка ПСН прыдбала навагоднія падарункі для дзяцей ды старэйшых і адзінокіх асоб. Усіх разам для 26 чалавек. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Мода на этнаграфію:

1. Ткацтва (Бельск-Падляшскі).
2. Магія (Нарва).
3. Музей-клас (Залукі).
4. Ганчарства (Гайнаўская белгімназія змагаецца ў турніры).

Буслік і Каця

Малой Элечцы

(казка)

„Ох, як холадна”, падумаў маленькі буслік, гледзячы на іскрыстае ад марозу наваколле, высокія гурбы снегу. „Няма як сагрэцца, няма чаго есці, няма нідзе Каці, а мне так холадна, жыццё ўцякае; ох, як добра было летам...”

Буслік стаў прыгадваць, як вясною прыляцеў разам са сваёй буслінаю сям’ёй у мясцовасць, у якой жыла Каця. Разам з ім прыляцелі яго бацькі, сябры, сваякі. Усе яны затрымаліся на чатырох вялікіх клунях і двух драўляных, старых стаўпах. Буслік быў шчасліцы, хадзіў па лугах, шукаючы жаб, лётаў з сябрамі над ваколіцай, вечарамі радасна клекатаў, абвяшчаючы свету, што ён малады, жыццярадасны і смела глядзіць у буслінную будучыню.

Аднойчы буслік убачыў дзяўчынку, якая хацела гуляць са сваімі равеснікамі, але яны насміхаліся з яе хваробы. Дзяўчынка ў маленстве перайшла аперацыю і адна ножка ў яе была карацейшай. Маці суцяшала дачушку, што ўсё будзе добра, але ліхія дзеці-насміхальнікі не даз-валялі ёй у гэта паверыць. Дзяўчынку звалі Кацяй. І калі сябры адмовіліся ад гульні з Кацяй, яна пайшла на луг выплакацца ўволю і крыху супакоіць нешчаслівую душу. Па лузе шпацыраваў буслік. Убачыўшы сумную дзяўчынку, не пабаяўся, падышоў і доўга-доўга глядзеў на яе. Каця прыкмеціла бусліка і пагладзіла яго па галоўцы. У адказ ён радасна заклекатаў. Так пачалося сяброўства Каці з клекатуном. Яны сустракаліся на лузе, разам гулялі і дзяўчынка ўжо не адчувала, што яна горшая за іншых дзяцей.

Міналі летнія дзянькі, праходзілі канікулы. Памаленьку надыходзіла восень. Сям’я бусліка пачала гатовіцца да вылёту ў цёплыя краіны. Аднак буслік не хацеў расставацца з Кацяй і вырашыў застацца. Сваякі-клекатуны пераконвалі, што гэта небяспечна, што зімовы холад можа яго забіць. Але буслік ведаў, што для яго важнае і вырашыў застацца.

Каця, не ведаючы пра выбар бусліка, паехала на чарговую аперацыю нагі. Халодным днём клекатун шукаў сваёй сяброўкі. Амаль замярзаючы, схаваўся ён у старым апушчаным хляўку і... заснуў.

Напаўжывога бусліка знайшла Каця. Яна не магла супакоіцца, штосьці мучыла яе душу, і яна вымаліла маму вярнуцца дадому раней. Дзяўчынка абагрэла бусліка сваімі слязамі, цёплым словам. У хаце ў Каці буслік перазімаваў. Ведаў, што сапраўднае сяброўства пераможа ўсе складанасці і перашкоды. Каця пераканалася, што сярод людзей можна быць шчаслівым, але веру ў сяброўства пасяліў у яе душы буслік, які не пабаяўся ахвяраваць за гэта сваім бусліным жыццём.

Анна Садоўская

Рашэнне конкурсу „Замкі Беларусі”

Адказ на конкурс у „Зорцы” № 8 за 2004 г.

Пытанне: Чаму замак у Смалянах называем Белым Ковелем?

Правільны адказ: Назоў ад прозвішча ўласнікаў і ад белага колеру, у які доўгі час быў памаляваны замак.

Узнагароды — кнігу вершаў Юрыя Гумянюка *Вуліца тыгровых архідэяў* — выйгралі: **Рафал Качаноўскі, Кацярына Мялешка, Анна Раманюк** і **Наталля Каўшук.** Віншуем!

Наш спонсар: Аляксандр Максімюк (http://valcomp.biz/setpro/).

Вясна

Ужо на полі
снег прапаў,
траўка зелянее.
Маранну-зімовую панну
спалілі,
у рэчцы ўтапілі.
А ў школе —
як у школе,
вядома: гульня і забава
у першы дзень Вясны.

Аня Артэмюк,
I „ц” кл. Гімназіі ў Аўгустове

Легенда пра скарб

Мая маці паходзіла з роду Чыквінаў, які славіўся майстэрствам і музыкай. Сам помню, як дзядзька маёй маці (яна была круглай сіратой і сваіх бацькоў амаль не помніла) Пятро, які быў здольным сталяром, выконваў прыгожыя і старанна агучаныя скрыпкі, на якіх сам выдатна іграў на забавах і вяселлях, а ягоны сын Павел (мой дзядзька, які яшчэ жыве) іграў на гармоніку.

І вось нейкі продак згаданага роду меў свой вадзяны млын на рэчцы Арлянцы, блізка Бахматоў, ва ўрочышчы Высранка каля пераезда праз рэчку ў напрамку Чахоў-Арлянскіх. Паводле іншай легенды на ўзгорку паблізу таго месца стаяла калісьці Петрапаўлаўская царква, якая ці то была спалена, ці праваліласа пад зямлю. Налева ад згаданай плаціны стаяў той млын і яшчэ сам з дзяцінства помню, як там тырчэлі з вады дубовыя палі ад таго млына. Дзеля дакладнасці хачу дадаць, што на самых Бахматах таксама стаяў вадзяны млын сям'і Герасімюкоў, які працаваў яшчэ ў міжваенны час. Уласнік „нашага" млына, мой продак, жыў з сям'ёй у Дубічах і штодзённа даязджаў на кані, каб людзям намалоць на хлеб.

Прамінаў час і надышла вясна 1813 года, калі недабіткі французскай арміі разам з польскімі памагатымі адступалі з Расіі. І вось адзін з польска-літоўскіх атрадаў затрымаўся на адпачынак побач таго млына маіх продкаў. Ваякі везлі з сабою каштоўныя скарбы, зрабаваныя ў Маскве і каля гэтага млына іх закапалі, а млын для непазнакі спалілі; асталіся ад яго адно згаданыя палі. Дзе дакладна схавалі, невядома, ёсць толькі меркаванні, што выкапалі яны вялікую яму ў дне вадаёма, у якую засыпалі скарб, а вада занесла ўсе сляды. Ваякі, калі закопвалі каштоўнасці, нікога з мясцовых людзей не дапускалі ў тое месца, а калі самі ад'ехалі, нічога пасля сябе не пакінулі, нават рэштак яды.

Людская памяць часта падводзіць і з белага зробіць чорнае або наадварот. У прыведзенай легендзе праўдзівае тое, што быў млын. Але хто каля яго адпачываў і што схаваў? Вядома, што ў кожнай легендзе бывае частка праўды; мо і каля Бахматоў, дзе мы ходзім, можа быць схаваны нейкі скарб.

Мікалай Панфілюк

Чырлідэркі ў Гайнаўскай белгімназіі

Пачынаючы з кастрычніка 2003 года ў нашай школе дзейнічае гурт чырлідэрак. Удзельнічае ў ім адзінаццаць дзяўчат з другіх класаў.

Сустракаемся два разы ў тыдні. У гэтым часе рэпеціруем старыя і складаем новыя танцавальныя сістэмы. Падбіраем музыку, праводзім таксама фізкультурныя практыкаванні. Амаль заўсёды танцуем пры музыцы тэхна. Крокі для нашых танцаў складаем самі або бярэм з тэледыскаў славутых спевакоў. Ва ўсім гэтым дапамагае нам настаўніца Бажэна Шакала — апякунка нашай групы.

Наш гурт танцуе на баскетбольных і валейбольных матчах. Найчасцей падахвочваем валейбалістаў з гайнаўскай каманды „Мадэратар". Праўду кажучы, не маем за сабой большых поспехаў, але яшчэ ўсё перад намі...

Паўліна Паўлючук

Адмірал і яго каманда

Павінае вока

Аніводзін з нашых матылькоў не ўмее так здзіўлена і трошкі палахліва глядзець вакол сябе, як павінае вока. Дарэчы, плямак-вачанят у яго ажно чатыры: два — на пярэдніх крыльцах і два — на задніх. Менавіта яны і далі такое незвычайнае імя свайму ўладальніку, бо здалёк падобныя на дзівосныя кропелькі, рассыпаныя на пер'ях славутай прыгажуні павы.

Як вядома, павы на Беларусі не жывуць. Затое павінае вока сустракаецца паўсюдна, пачынаючы з ранняй вясны і да позняй восені. Вусені гэтага матылька звычайна трымаюцца на калючцы-крапіве, іншым раслінам яны не шкодзяць. Асабліва нястомна пырхае-танцуе павінае вока сонечным лагодным ранкам. Матылёк пералятае з кветкі на кветку, то складвае, то зноў раскладвае свае зіркатыя крыльцы, нібыта просіць:

— Спыніцеся хоць на хвілінку! Паглядзіце, якое навокал хараство! Паслухайце музыку спелага лета...

Бачыце, як блізка ад некранутай яшчэ касой травы-муравы да беласнежных аблокаў?

Чуеце, як трывожна гайдаецца разам з намі планета Зямля?

Уладзімір Ягоўдзік

Нашы лаўрэаты

Вядомыя ўжо пераможцы прадметнага конкурсу беларускай мовы для пачатковых школ. Сярод 17 фіналістаў з 7 школ (ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім, Нарве, Гайнаўцы н-р 3 і н-р 6, Дубінах, Дубічах-Царкоўных, ПШ н-р 4 у Беластоку) лаўрэатамі сталі: **Аксана Федарук** з бельскай „тройкі", **Паўліна Дзмітрук** з Нарвы, **Юстына Тарасевіч** з Гайнаўкі (ПШ н-р 3), **Ілона Дарота Скепка** з Дубіч-Царкоўных.

Віншуем!

Дарагая „Зорка"!

Я хачу расказаць пра школьны конкурс „Роднае слова". Конкурс адбыўся 15 сакавіка 2004 г. Удзел у ім прыняў 31 вучань з II-VI класаў. Мы дэкламавалі вершы пра коцікаў, птушак, прыроду, учынкі дзяцей — большасць вершаў была аўтарства Віктара Шведа.

Пераможцамі конкурсу сталі: **Рафал Тамашук** з IV класа, **Агата Антасюк** з II кл., **Бася Хіліманюк** з III кл. ды **Моніка Яноўская** з VI класа. Вылучэнні атрымалі: **Паўліна Паскробка**, **Дарота Цімашук** і **Марцін Стоцкі** з IV класа, **Паўліна Гіншт** з II кл., **Наталля Петручук** і **Агата Балтрамюк** з V класа.

Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі ўзнагароды, спонсарам якіх быў **Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь**.

Конкурс „Роднае слова" гэта спаборніцтвы і свята беларускай паэзіі ў школе.

Эля Анджаеўская, IV кл., ПШ у Дубінах

Падзяка

Рэдакцыя „Зоркі" сардэчна дзякуе за Велікодныя пажаданні нашым верным чытачам — гайнаўскім белгімназістам і настаўніцы **Іаланце Грыгарук**.

Дарагія сябры! Вашы цудоўныя паштоўкі, традыцыйна ўжо, упрыгожваюць нашу рэдакцыю. Усяго Вам добрага.

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

▼	As	Owies	Warty pałac / Piosenka	▼	Ryj	▼	Soja	Upiększenie	▼
	Chochla / Droga ▶	▼	▼		▼				
Szwecja ▶	▼						Balon		
Los ▶				Ar			▼		
▶				▼					
Wiosna		Kiermasz ▶							

Адказ на крыжаванку н-р 12: Густ, куст, граб, грыва, рыбак, губа, шок, лён, мак, вусны. Гук, груша, грыбок, рыбак, кава, кубак, лёс, атрасіны.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Анэта Купрыяновіч** і **Віялета Плашкевіч** з Нарвы, **Міхал Якімюк** і **Наталля Каўшук** з Гайнаўкі, **Ева Казлоўская** з Бельска-Падляшскага, **Ян Сегень**, **Юстына Данельчык**, **Марцін Стоцкі** і **Барбара Анджаеўская** з Дубін. Віншуем!

Трэці раз па-за саборам

З 25 па 30 мая ў Беластоку прагучыць XXIII Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка 2004". І хаця два гады таму Праваслаўная царква пачала праводзіць асобнае мерапрыемства, прысвечанае агляду царкоўнай музыкі, то Фестываль запачаткаваны ў 1982 годзе Мікалаем Бушко з'яўляецца як заслужаным для падтрымкі царкоўнай спадчыны праектам, так і першапраходцам у гэтай сферы. Ніжэй прапануецца гутарка з ІРЭНАЙ ПАРФЯНЮК, шматгадовым дырэктарам Арганізацыйнага бюро Фестывалю.

Гэты тыдзень, несумненна, адрозніваецца ад кожнага іншага ў годзе — чалавек перагружаны працай, адказнасцю за робленае і, нельга скрываць, напругай...

— Фонд „Царкоўная музыка" гэта не адны Міжнародныя фестывалі царкоўнай музыкі?..

— Фактычна, гэта яшчэ шмат раўнабежных праектаў. Першым такім значным нашым пачынам было выратаванне цікавага будынка, які арыгінальна служыў чыгуначным прыпынкам у Чарлёнцы — мы яго купілі ад дзяржаўнай чыгункі і зараз у ім сядзіба Фонду, бюро Фестывалю ды Цэнтр прамоцыі рэгіёна. Цэнтр прамоцыі рэгіёна не з'яўляецца асобным юрыдычным утварэннем, а толькі адной з формаў дзейнасці Фонду „Царкоўная музыка". Праводзім мы ў Гайнаўцы серыю сустрэч пад агульным лозунгам „Гутаркі пра...". Нашымі гасцямі, між іншымі, былі Сімона Косак, Лявон Тарасэвіч, Анджэй Струміла, Адам Вайрак, Крыстыян Матысак ды Маргарыта Карпюк і Марыюш Ажахоўскі, якія хоць і асобы маладыя, але вельмі моцна ўжо расславілі ў Польшчы нашу Гайнаўку. Паказваем тут жыхарам горада значныя фільмы, як хаця б „Піяніст". Рэгіён наш неад'емна звязаны з Белавежскай пушчай, а ў сувязі з гэтым вакол нашага Цэнтра прамоцыі згуртаваліся прыродазнаўчыя таварыствы, як Таварыства аховы краявіду, Таварыства аховы Белавежскай пушчы ці гурток экскурсаводаў. Іхнія сябры ў нас сустракаюцца, тутака сядзіба Таварыства аховы краявіду. Наш цэнтр гэта таксама выстаўкі, у іх ліку і экспазіцыі звязаныя з Фестывалем, ды „Ператоча", першы выпуск якога адбыўся ў Белавежы ў верасні мінулага года, а сёлетні плануецца на ліпень. „Ператоча" — мастацкія сустрэчы народаў, якія на працягу гісторыі насялялі або і зараз насяляюць наш рэгіён.

Першым такім значным нашым пачынам было выратаванне цікавага будынка, які арыгінальна служыў чыгуначным прыпынкам у Чарлёнцы (...) зараз у ім сядзіба Фонду, бюро Фестывалю ды Цэнтр прамоцыі рэгіёна...

— Дому культуры, які тут побач, застаецца што-небудзь да работы?..

— Фонд гэта няўрадавая арганізацыя і ў гэтай сферы разгортвае сваю дзейнасць. Працу ў доме культуры мы дасканала ведаем — ён, так лічу, больш засяроджваецца на аматарскім руху і калектывах. Мы прапануем тое, на што дазваляе наша база.

— У апошнія гады Фонд дасведчыў нямала праверак...

— Так, шмат што на гэта склалася — таксама і допісы ў прэсе, у якіх фармуляваліся закіды ў немэтазгодным выкарыстанні намі сродкаў ды ў няправільных разліках дзяржаўных датацый. Частку тых кантроляў мы ўжо перажылі, а што яшчэ чакае нас у будучым — не ведаем. Быў аўдыт фінансаў юбілейнага XX Фестывалю, была праверка з Міністэрства культуры (2002 г.), якая прасочвала нашы расходы на арганізацыю Фестывалю царкоўнай музыкі, ды праверка Найвышэйшай кантрольнай палаты — НІК (2003 г.). З задавальненнем хачу адзначыць, што ўсе праверкі пацвердзілі як мэтазгоднасць нашых расходаў, так і правільнасць ды тэрміновасць нашых фінансавых разлікаў.

— А газеты, яны адкруцілі свае намёкі і спекуляцыю?..

— Нам прыкра, што нягледзячы на нашы просьбы — праўда, яны фармуляваліся ўсяго па тэлефоне, але ўсё ж — ніводная рэдакцыя не пакваПілася спраставаць ці паінфармаваць сваіх чытачоў пра фактычны стан рэчаў — вось, мы ўжо пасля кантроляў, якія поўнасцю нас апраўдалі, — а ўсе надалей падтрымліваюць стан здогаду ды западозранасці нас у злачынстве.

— Гэта ўжо такая краса беластоцкай прэсы. З другога аднак боку, у гэтым годзе будзе трэці выпуск Фестывалю, які праводзіцца ў становішчы „разводу з Царквою". Як гэта ўплывае на агульную кандыцыю мерапрыемства?

— У журналіста сваё права ўжываць тыя тэрміны, якія ён лічыць правільнымі. Па-мойму ніякага разводу не адбылося, бо і як ён меў бы адбыцца? Але фактычна, сёлетні XXIII выпуск Фестывалю, як і два папярэднія, адбываецца па-за Саборам св. Тройцы. Кандыцыя мерапрыемства, з якога боку да яго ні прыглядацца — уласцівая. У Фестывалю адпаведны мерытарычны ўзровень, вялікая зацікаўленасць хораў, гісторыя, традыцыя ды адпаведныя напрацоўкі і дасягненні, якія з гэтай традыцыі вынікаюць. У хораў, якія да нас прыязджаюць, досвед шматлікіх еўрапейскіх і сусветных фестываляў — яны нам зайздросцяць і віншуюць нашых дасягненняў. Праблема, як і ва ўсёй гаспадарцы, фінансавая. Мы не заўсёды ў змозе задаволіць усе спадзяванні нашых хораў-гасцей — некаторыя клопаты гэтага кшталту могуць узнікнуць і ў гэтым годзе.

— Як балансуецца фінансаванне Фестывалю — пераважае ўрадавая датацыя ці прыватная?

— Пункт цяжкасці раскладаецца тут пароўну, хоць і не ў тым памеры, на які мы разлічваем. У мінулым годзе Фестываль не атрымаў падтрымкі з боку ваяводскіх улад, але ў гэтым годзе гэта мяняецца — маем дэкларацыю падтрымкі з боку Маршалкоўскай управы. Трэба таксама памятаць, што Падляшша, як рэгіён — беднае, і таму яно скупое прыватнымі спонсарамі.

— Каторы год Вы старшынствуеце Арганізацыйнаму бюро Фестывалю?

— Ёсць клопат з адказам на гэтае пытанне. Здаецца, будзе ўжо больш за дзесяць.

— Як збольшага выглядае Ваш фестывальны тыдзень?

— Пачну з самай прыемнай у жыцці чалавека рэчы — сну. Сон у час Фестывалю або кароткі, або хуткі — трэцяй магчымасці не бывае. Гэты тыдзень, несумненна, адрозніваецца ад кожнага іншага ў годзе — чалавек перагружаны працай, адказнасцю за робленае і, нельга скрываць, напругай...

— У Фестывалі Вам дапамагаюць і валанцёры?..

— Абсалютна так. Шмат чаго можна падрыхтаваць яшчэ да мерапрыемства, але калі пачынаюць прыязджаць госці, дык мы выручаемся нашымі прыхільнікамі, якія добраахвотна апякуюцца хорамі. На валанцёраў можна паспадзявацца і ў шмат якіх іншых справах — шчырае ім дзякуй за іхнюю працу і падтрымку для Фестывалю. Мне вельмі прыемна, калі хоры дзякуюць за мілы прыём і апеку, якую яны мелі ад сваіх праваднікоў-валанцёраў.

— Царкве хіба няцяжка адцягваць ад Фестывалю хоры, якія, умоўна кажучы, знаходзяцца ў сферы яе ўплываў?

— Непамерна шкадуем, што не па нашым рашэнні ў Фестывалі не ўдзельнічаюць польскія праваслаўныя прыхадскія хоры. Ужо гадоў 15 назад быў адзін выпуск Фестывалю, калі ўладыка Сава забараніў удзельніцтва ў ім хорам Беластоцка-Гданьскай епархіі. Факт гэты аднак без уплыву на кшталт Фестывалю, бо ад пачатку ажыццяўляецца ён з захаваннем сваёй конкурснай формулы з падзелам на нязмененыя ад пачатку катэгорыі. Бесперабойна наведваюць нас замежныя праваслаўныя прыхадскія хоры.

— Ці не будзе так, што ўсё ж мерапрыемства пераўтворыцца ў фестываль класічнай музыкі, падшытай спадчынай усходняй культуры?

— Фестываль мяняецца, але не ў сваёй конкурснай частцы, у якой выконваецца і ацэньваецца міжнародным журы выключна царкоўная музыка. Тыя змены, якія адбываюцца побач, сведчаць толькі пра прагрэс, але яны не дакранаюцца да конкурсу ды не мяняюць традыцыйнай формулы Фестывалю, паводле якой у хораў абавязак падрыхтаваць царкоўны рэпертуар.

— Запрашаюць Вас на „Дні царкоўнай музыкі"?

— Ні я асабіста, ні дырэктар Мікалай Бушко — ініцыятар імпрэзы — не мелі гонару атрымаць такое запрашэнне. Не абазначае гэта, аднак, што дарога туды нам закрыта. Затое мы заўсёды кіруем такія запрашэнні да шмат якіх асабістасцей, царкоўных іерархаў не выключаючы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр Максімюк

Антон Васілеўскі (1891 — 1984)



Міхась Красоўскі (1904 — 1985)

Эдмунд Вайсковіч (1906 — 2000)



Эдуард Шчасновіч (1912 — 1997)

Былі з намі

Віктар Рудчык (1934 — 1989)

Мікола Гайдук (1933 — 1998)

І курганам сівым імёны вернем,
Імёнамі асветліцца наш шлях...
Віктар ШНІП

Гоніць прамінанне, штораз менш сустрэчаў — усё больш расстанняў, — у сваім апошнім зборніку напісаў **Міхась Шаховіч**. Ён жа, хлопец з Сакоў, народжаны ў 1953 годзе, выдаў першыя свае вершы пад загалоўкам *Прамінанне*, у 1978 годзе, і тыя словы былі быццам бы прадказаннем тае хвіліны ў чэрвені 2000 года, калі абарвалася нітка ягонага гарачага жыцця. У момант, калі глядзеў у вочы наканаванай смерці, вёў размову, як расказвала пасля ягоная жонка, з кімсьці ёй нябачным, — па-беларуску. Быццам з нейкім пісьменнікам, ці то калегам з рэдакцыі. Не ўсе жонкі разумеюць мову паэтаў і тых, каго яны бачаць... Можа, у дарогу збіраў Міхася **Мікола Гайдук**, таксама нівец ды „белавежац", які зведаў і сівую даўніну, і кожную сцежачку Айчыны, памерлы двума гадамі раней (1933 — 1998), таксама філолаг, збіральнік роднага ды народнага, які чуў, аб чым шуміць Белавежская пушча? Па іх абодвух засталіся архівы ды прачытаныя кнігі, якія чакаюць, стуліўшы лісты, на такіх адкрывальнікаў спраў простых і таемных, як Міхась і Мікола... А, можа, быў гэта **Юрка Геніюш** (1935 — 1985), доктар, народжаны ў Зэльве? *На пачатку было толькі слова* — апублікаваў пры жыцці, а наступныя зборнікі — *Да свету* (у зборніку з маці Ларысай Геніюш *Маці і сын*) і *З маёй званіцы* паказаліся ўжо пасмяротна. Жартаўнікі абодва, Міхась ды Юрка, бо пяром змагаліся смешным са злосным. А, можа, гэта быў **С. Заставін**, Лявон Майсяюк (1935 — 1997) з Белавежы, аўтар гумарыстычных апавяданняў у „Ніве", якога гаворка была белавежская, як і гаварылася тады. А ці не **Дзядзька Квас**, — Міхась Красоўскі (1904 — 1985), найбольш дасціпны і таленавіты наш дзед вясковы, разоры і палоскі якога праляглі ў нашай памяці? Тыя, хто мог сустракаць такога паэта, а ўсе паэты — цудакі, як кажуць звычайна людзі — мабыць, падобныя нечым, свае. І не кожны там застаўся з нессівелай чупрынай ды выйшаў на мяжу нашага жыцця — як і **Марылька Базылюк** (чые літаратурныя спробы, дасланыя чытаў быў малады паэт Міхась), настаўніца і мама, сяброўка і жонка, якую хвароба зламала ў 38 гадоў, але і **Антось з Лепля** (Антон Васілеўскі), адзін з першых „белавежцаў", народжаны яшчэ ў XIX стагоддзі (1891 — 1984), які быў і паштаром, і хірамантам, і гамеапатам, апрача таго, што знакамітым празаікам, і **Васіль Баршчэўскі** (1931 — 2000), родам з Бандароў, знаёмым *Моцнага Яся* — плытагона. Жывыя „ніўцы" (супрацоўнікі і чытачы) памятаюць і **Аляксея Карпюка**, і **Аляксандра Рыбінскага**, і **Вінцука Склубоўскага** (1911 — 2002) — знакамітага празаіка, які хаваўся пад псеўданімам Сава, і юрыста, які кожны панядзелак чакаў з добрай парадай у ніўскіх пакоях. А, можа гэта непаседлівы **Віктар Рудчык** (1934 — 1989) быў, той размоўца з Міхасём на парозе з жыцця, браў прафесійнае, як заўсёды, інтэрв'ю ці проста пытаўся ў Шаховіча, як калісьці, заглянуўшы ў іншы рэдакцыйны пакой, вяртаючыся з журналісцкіх шляхоў з былых партызанскіх сцежак і пагубленых у віры вайны людзей? А, можа, раптам нарваліся нашы карэспандэнты — дзед **Кастусь Пятэльскі** з Крушынян, талковы і элегантны, ці вясёлы лістаноша з Бабік **Эдуард Шчасновіч** альбо гайнавянін **Эдмунд Вайсковіч**?..

Юрка Геніюш (1935 — 1985)

Марылька Базылюк (1959 — 1996)

Міхась Шаховіч (1953 — 2000)

Васіль Баршчэўскі (1931 — 2000)

Вінцук Склубоўскі (1911 — 2002)

Не ведаем, як там. І ці ў іх ёсць памяць аб нас. Ад іх засталіся сляды — словы, *якія былі на пачатку*, задрукаваныя лісты паперы. У кожнае з іх укладзена было сэрца.

Міра Лукша

„Нашаніўцы” надалей адстойваюць гонар і годнасць свайго народа...

www.nn.by

Пэўна кожны, хто вучыў у школе беларускую літаратуру і гісторыю помніць, што адной з першых газет, якія стаялі ля вытокаў беларускага адраджэння пачатку мінулага стагоддзя была „Наша Ніва”. Заснаваная ў 1906 годзе мела досыць прыхільнікаў і сапраўды натхняла беларусаў на барацьбу за права „людзьмі звацца” ў тыя далёкія часы схілу Расійскай імперыі.

З той пары мінула амаль стагоддзе. Але, калі шчыра, і дагэтуль актуальнымі застаюцца памкненні „нашаніўцаў” у адстойванні гонару і годнасці свайго народа, сваёй не так даўно стаўшай незалежнай дзяржавы. У сённяшніх умовах „Нашай Ніве” несці да людзей незалежнае беларускае слова, што не кажыце, лягчэй, бо дапамагае Інтэрнэт.

Калі карыстальнік выйдзе на сайт пад адрасам www.nn.by, то ўбачыць „да краёў” напоўненую інфармацыяй старонку. Яе загаловак чамусьці „Bielarus.info”. Далей указаныя адпаведныя адрасы, але адкрываецца толькі той, які маецца ў назве гэтага артыкула. Тым не менш, гэта не перашкода, каб пазнаёміцца з асноўным зместам „Нашай Нівы”.

Галоўная старонка сфармавана такім чынам, што адразу на вочы трапляюцца першыя два асноўныя артыкулы і выяўленне першай паласы газеты.

Найважнейшыя артыкулы падаюцца пад рубрыкай „Люстра дзён” і маюць вялікія анонсы, якія па сутнасці з'яўляюцца нататкамі аб змесце ўсяго артыкула. А цалкам яго можна прачытаць клікнуўшы альбо на загаловак, альбо на слова *Далей*.

Побач размешчаны пераход на змест усіх артыкулаў газеты пад назвай „Апошні нумар «Нашай Нівы»”. Такая акалічнасць значна спрашчае пошукі патрэбнага матэрыялу і дае магчымасць убачыць аб чым піша газета ў даным нумары, нават не чытаючы яго. Чымсьці гэта нагадвае змест кнігі.

Зверху размешчаныя рубрыкі, якія даюць магчымасць пазнаёміцца амаль з усімі бакамі сучаснага грамадскага жыцця Беларусі. Першая рубрыка так і называецца „Беларусь”. У ён падборка ўсіх артыкулаў аб падзеях і здарэннях у розных сферах беларускай рэчаіснасці, пачынаючы ад кастрычніка 2002 года.

У рубрыцы „Сьвет” месцяцца матэрыялы, якія тычацца міжнародных стасункаў беларускай краіны, замежны погляд на сітуацыю ў ёй і, адпаведна, погляды беларусаў на замежныя падзеі.

„Каментары” гэта ўжо больш удумлівае аналізаванне таго ці іншага здарэння альбо працэсу, што маюць ці мелі месца ў паўсядзённым жыцці. Варта пазнаёміцца з разнастайнымі поглядамі на іх не толькі журналістаў, але навукоўцаў і публіцыстаў. Далей ідуць „Гаспадарка і грошы”, „Спорт”, „Навука”, „Гісторыя”, „Культура” і „Літаратура”.

Рубрыка „Гумар” апраўдвае сваю назву. Вялікая колькасць цікавых фельетонаў і гумарэсак дазваляюць пад іншым вуглом паглядзець на тое, што робіцца навокал.

Знізу старонкі дзяленне на рубрыкі за выключэннем „Словаў” і „Лістоў у рэдакцыю”. „Словы” нечым перагукаюцца з „Бі-бі-сі” Міхася Андрасюка, а „Лісты ў рэдакцыю” даюць магчымасць пазнаёміцца з думкамі такіх жа як мы чытачоў.

Сайт „Нашай Нівы” ўтрымлівае ў сабе змест артыкулаў газеты, пачынаючы ад 2002 года. А акрамя гэтага, можна віртуальна пагартаць старонкі пабачыўшых свет нумароў часопіса „Архэ”, калі праз www.nn.by выйсці на сайт гэтага выдання.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...

Статная дзяўчына з вёскі Хрышчонавічы Свіслацкага раёна адразу трапіла на вокладкі папулярных часопісаў. Значны час яе імя бессаромна выкарыстоўвала афіцыёзная прапаганда...

www.pressball.by

На зялёным кантыненце — II частка
(2000, Сідней, 17 медалёў)

Анатоль Ларукоў заваяваў першы алімпійскі медаль у гісторыі беларускага дзюдо. Мінскі барэц саступіў толькі італьянцу Мадалоні, які і стаў чэмпіёнам. А ў барацьбе за трэцяе месца Ларукоў перамог чэмпіёна свету амерыканца Педра. Першую ўзнагароду ў гісторыі Беларусі па сучаснаму пяцібор'ю здабыў і Павал Доўгаль, на поспех якога мала хто спадзяваўся. Цяжкаатлету Генадзю Аляшчуку бронза „перапала” толькі праз некалькі дзён пасля выступу — з тае прычыны, што балгарскага штангіста Ангелава напаткала допінгавая дыскваліфікацыя. Тым не менш, гэты медаль быў заслужаны, таму што Аляшчук набраў з балгарынам аднолькавую вагавую суму.

Ігар Астапковіч, ураджэнец Наваполацка, ужо шмат гадоў жыве і трэніруецца ў Гродне. Гэты асілак заслужыў тытул „вечна другога”. Сабраўшы вялікую колькасць узнагарод (у іх ліку ажно тры срэбры чэмпіянатаў свету), Астапковіч так і не здабыў золата на важнейшых лёгкаатлетычных форумах. Толькі аднойчы яму пашчасціла — на чэмпіянаце Еўропы 1990 года.

На зялёным кантыненце спартоваму свету адкрыла свой талент беларуска Яніна Карольчык. У апошняй шостай спробе Карольчык літаральна вырвала залаты медаль у суперніц — 20 метраў 56 сантыметраў (на той час новы рэкорд Беларусі). Статная дзяўчына з вёскі Хрышчонавічы Свіслацкага раёна адразу трапіла на вокладкі папулярных часопісаў. Значны час яе імя бессаромна выкарыстоўвала афіцыёзная прапаганда. Так фота прыгожай штурхальніцы ядра (вялікая рэдкасць у гэтай атлетычнай дысцыпліне) доўгі час красавалася на рэкламных шчытах газеты „Советская Белоруссия”. Зусім нядаўна Карольчык прызналася, што шкадуе пра гэта і яе папросту падманулі. Пасля яшчэ аднаго трыумфу на чэмпіянаце свету 2001 года ў Эдмантане ў жыцці Карольчык наступіла чорная паласа. Зараз яна адбывае допінгавую дыскваліфікацыю. Усе дзяржаўныя „дабрадзеі” адразу забыліся пра маладую зорку айчыннага спорту, а ў 27-гадовай Яніны ёсць час на жыццёвае асэнсаванне.

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Мы рабілі беларускае кіно

Інтэрв'ю са СВЯТЛАНАЙ ЗЕЛЯНКОЎСКАЙ.

— Як успрынялі Ваш фільм у Беларусі? — пытаю Святлану Зелянкоўскую, якая ўвасобілася ў постаць Анастасіі Слуцкай.

— Беларускія гледачы вельмі чакалі фільма „Анастасія Слуцкая”. Даўно ў нас не было такога нацыянальнага фільма, які хацела б глядзець большасць беларускіх гледачоў. Спачатку была праведзена вялікая рэкламная акцыя. Я была на творчых сустрэчах у 22 раёнах Мінскай вобласці. Мяне вельмі радавала, што спатканні былі мнагалюднымі. Людзі вераць, што беларускае кіно і мастацтва адраджаюцца, што перад імі будучыня. Калі мы будзем вырошчваць цікаўнасць і павагу да свайго, напэўна будзем адраджацца і ўзрастаць. Мне здаецца, што патрэбны яшчэ подых маладых рэжысёраў.

— Якая атмасфера панавала на здымачнай пляцоўцы?

— Хваляванне было вялікае, але мне дапамагалі партнёры, беларускія акцёры і я ім кажу вялікі дзякуй. Рэалізуючы фільм я сутыкнулася з вельмі творчымі людзьмі. На пляцоўцы заўсёды была цёплая атмасфера, бо мы ж рабілі наша беларускае кіно. Мы рабілі тое, што нам блізкае, тое, што любім. Гэта відаць у нашых сцэнах, позірках, эмоцыях і перажываннях.

— Гледачам вельмі спадабаліся касцюмы.

— Нашы мастачкі хацелі зрабіць беларусаў прыгожымі і годнымі. Кожная дэталь у касцюмах была распрацаваная. Мая карона была вельмі прыгожая, але і вельмі цяжкая і яе прыходзілася прымацоўваць да валасоў.

— Напэўна цяжкім быў таксама ваенны касцюм.

— Мой ваенны касцюм апранаўся недзе каля гадзіны. Кальчуга была сапраўднай, хаця ў жаноцкім варыянце. Калі дабавіць да гэтага металічныя наручы, наплечнік, плашч, які рэзаў па шыі і перакошваў на адзін бок ды металічны каўнер — усё важыла каля 20 кілаграмаў. У гэтым трэба было хадзіць увесь дзень. Здымкі ў гэтай зброі рабілі мы ў кастрычніку і лістападзе і ўся яна перамярзала. Я не адчувала сваіх рук і ног, а мне трэба было яшчэ скакаць на кані і трымаць у руцэ сапраўдны меч.

— Як Вы трапілі на здымачную пляцоўку, каб іграць галоўную ролю?

— Спачатку былі спробы і запрашалі амаль усіх актрыс, якія падыходзілі па ўзросту. Пасля быў накірунак у бок вядомых расійскіх акцёраў і мяне не зацвердзілі. Толькі пазней рашыліся ізноў адкрываць нашых беларускіх актрыс. Пасля доўгіх конкурсаў зацвердзілі мяне.

— Ці можа атрымалі Вы ўжо прапановы роляў у іншых фільмах?

— Не ведаю ці можа спужаліся рэжысёры, але пакуль ніякіх прапаноў не было. Я так і думала, што пасля такой вялікай ролі, пасля такога праекта, павінна быць паўза. Не кожны рэжысёр адважыцца запрапанаваць ролю галоўнай гераіні, якая паказвае станоўчы вобраз Беларусі. Калі б была цікавая карціна і сюжэт, я нават згодна была б на нейкі эпізод. Акцёр заўсёды павінен быць у дзейнасці і адчуваць, што ён патрэбен.

— На фільмавай пляцоўцы Вы пачалі выступаць пазней. Першыя крокі рабілі Вы на тэатральнай сцэне.

— Ужо ў дзяцінстве я гаварыла, што хачу стаць актрысай, працавала ў школьных тэатральных гуртках. Першым сутыкненнем з тэатрам, які засеў у маю душу, была сустрэча з фальклорным тэатрам „Госціца”, які быў на беларускім тэлебачанні. Там мяне накіравалі на тэатральную сцежку. Пасля паступіла я ў Акадэмію мастацтваў і займалася ў Валерыя Раеўскага — мастацкага кіраўніка Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы. Ён запрасіў палову курса ў свой тэатр і так я сур'ёзна распачала тэатральную дзейнасць.

— Чым цікавіцеся па-за працай? Як праводзіце вольны час?

— Цікаўлюся беларускім фальклорам і песняй. Вольны час праводжу з дачкой Ксеніяй, якой 4 гады. Хацелася б, каб яе жыццё склалася ў творчасці. Я люблю вандроўкі. Хочацца выязджаць і глядзець новае.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

ЮРЫСТ РАІЦЬ

У апошнім часе многа гаворыцца аб неразважных здзелках пры закупе машыны, якая часта аказваецца крадзенай. Тады пачынаюцца праблемы з паліцыяй, якая канфіскуе машыну. Што зрабіць каб пазбегчы такога няшчасця распавядае юрыст **Пятро Юшчук.**

— Галоўным пры закупе машыны з'яўляецца праверка крыніцы, з якой яна паходзіць. Правяраем дакументы прадаючай асобы і рэгістрацыйныя дакументы машыны. Звяртаем увагу на тое, ці машына зарэгістраваная ў Польшчы, правяраем год прадукцыі, ідэнтыфікацыйны нумар машыны — гэта ўсё павінна быць у рэгістрацыйных дакументах. Правяраючы даныя ўладальніка машыны запісваем яго імя, прозвішча, нумар дакументаў, месца пражывання. Важнае, ці прадаваная машына з'яўляецца выключнай уласнасцю прадаўца. Калі машына належыць фірме, правяраем яе статус: ці гэта машына легкавая ці грузавая, бо ад таго залежыць падатак ПДВ (VAT), які пакупнік абавязаны заплаціць.

— А што зрабіць, калі замарылася нам іншамарка і каб было танней купляем яе на аўтабіржы?

— Пачаткова вядзем сябе так як у першым выпадку. Правяраем рэгістрацыйныя дакументы, пашпарт прадаўца і ўсё запісваем. Абавязкова мусім праверыць дамову цяперашняга ўладальніка машыны з папярэднім. Пры закупе машыны прывезенай з-за мяжы трэба праверыць ці даная машына перайшла мытны кантроль і ці была заплачана пошліна. Тады толькі абыдуць нас праблемы з мытнымі службамі. Трэба памятаць, што часам ашчаднасць можа нас каштаваць падвойна.

— Машына, якую хочам купіць, аказваецца сабранай з некалькіх машын (г.зв. „składak"); на што тады звяртаць увагу?

— Напэўна трэба праверыць фабрычны нумар — WIN. Я раю ў кожным з выпадкаў звяртацца за інфармацыяй у аддзел камунікацыі. Там даведаемся ці самаход не быў крадзены, хто яго сапраўдны ўладальнік.

— Часта здараецца, што пры закупе машыны рэгістрацыйныя дакументы і пашпарт уладальніка выглядаюць нармальна. Што рабіць, калі пазней акажацца, што яна крадзена?

— Такіх сітуацый многа і тады пачынаюцца сапраўдныя праблемы. Людзі, купляючы машыну, аддаюць усе зберажэнні, бяруць крэдыты, а тут раптам аказваецца, што машына крадзена, або не аплачана пошліна (мытныя службы дамагаюцца аплаты 30% вартасці машыны). Калі набытчык не мае на аплату грошай, падаткавыя службы маюць права заняць машыну. Не памогуць ні тлумачэнні, ні плач, ні просьбы... Купляючы машыну на біржы, трэба быць свядомым такой небяспекі. Калі на працягу пяці гадоў карыстання машынай не акажацца, што яна крадзена або не была заплачана пошліна, набытчыку нішто ўжо не пагражае.

— Але не ўсе ездзяць машынамі пяць гадоў. Калі пасля года прадамо яе і ў новага ўладальніка акажацца, што машына была крадзена, ці астатняму прадаўцу пагражае нейкая кара?

— Так. Спрацоўвае тады ланцуговая рэакцыя адказнасці. Нават калі не маем паняцця, што машына крадзена, яе прадавец нясе адказнасць. За гэта пагражае кара ўмоўнага пазбаўлення волі ад 3 месяцаў да 5 гадоў, або штраф. Набытчык траціць усё — і грошы, і машыну, і добрае імя. Параіць магу толькі тое, каб купляць машыну з добрай, праверанай крыніцы.

— Дзякую за парады.

Гутарыла Паўліна Шафран-Асташэвіч

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Прыму на працу маладога сталяра з вопытам да вырабу дзвярэй і акон, тэл. 0606 640 548.

• Шукаю маладых жаноча-мужчынскіх цырульніц з вопытам, з фантазіяй, адважных і прыхільна настаўленых да кліентаў, праца ад зараз, тэл. 0508 061 006.

• Прыму на працу вучаніцы цырульніцтва, патрабаванні — прыгожы выгляд, ахвота да працы, тэл. 0501 224 847.

• Мужчыну з Беластока або аколіц да будаўнічых прац, мінімальны вопыт, спраўнасць і некаральнасць, тэл. 0606 953 077.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Малады мужчына з Беластока, тэхнічная адукацыя, правы кат. В, уласная машына, тэл. 0508 988 782.

• Будаўнічыя правы, санітарны мінімум — любая праца ў Беластоку, тэл. 711 83 49.

• Жанчына, 37 гадоў, стаж працы ў гандлі, кніжка здароўя, тэл. 0507 600 470.

• Жанчына, 42 гады, вопыт у гандлі на кіраўнічай пасадзе, абслуга камп'ютэра, падставовае веданне англійскай мовы, правы кат. В, зацікаўленая працай у Бельску-Падляшскім, тэл. 0603 727 489.

• Ахвотна заапякуюся дзіцём, закончаны педагагічны інстытут, вопыт, тэл. 0609 294 448.

• Танна прыбяру бюро, кватэру, тэл. 676 17 64.

• Адказная, сумленная жанчына заапякуецца малым дзіцём, тэл. 0503 399 265.

• Студэнтка-завочніца заапякуецца дзіцём у Бельску-Падляшскім, тэл. 0601 240 086.

• Мужчына, 32 гады, правы кат. ВС, кніжка здароўя, санітарны мінімум, прыме кожную працу, тэл. 0605 358 382.

• Жанчына, 50 гадоў, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 0508 752 167.

• Студэнтка педагогікі, без дрэнных схільнасцей, вопытная, заапякуецца дзіцём, тэл. 0694 823 355.

• Маладая жанчына шукае працу ў Беластоку, музычная адукацыя, добрае веданне англійскай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0505 539 228.

• Вышэйшая эканамічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 661 38 78.

• Пекар, вопыт у гастраноміі, кніжка здароўя, санітарны мінімум, тэл. 722 08 80.

• Жанчына, 29 гадоў, з вопытам у гандлі, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра, шукае працу ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0508 243 608.

• Мужчына, тэхнічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, вопыт працы ў механічнай майстэрні, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0509 402 663.

• Маладая жанчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы хоча набыць вопыт у бухгалтэрыі (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0696 557 835.

• Абітурыентка русістыкі шукае працу ў Беластоку, тэл. 0601 421 871.

• Студэнтка пятага курсу маркетынгу ПБ, падставы англійскай мовы, абслуга камп'ютэра, правы кат. В (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 769 109.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я будзе ўдзячная за вясенняе адзенне для дзяцей ва ўзросце 4-12 гадоў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе яды (кансервы, мука, цукар), сродкаў гігіены (шампунь) і дзіцячага адзення.

• Самотная маці з 3 дзяцьмі патрабуе старога тэлевізара, канапы і пасцелі.

• Пяціасабовая сям'я патрабуе пасцелі і вясенняга адзення для хлопцаў ва ўзросце 5, 7 і 9 гадоў.

• Сям'я з 4 дзяцьмі будзе ўдзячная за любую помач.

• Сям'я патрабуе мэблі, дзіцячых вясенніх ботаў, адзення для дзяўчат ва ўзросце 9,10 і 13 гадоў.

• Сужонства з 4 дзяцьмі патрабуе мэблі, пасцелі, цёплых ботаў для 5- і 7-гадовых хлопцаў і 11- і 13-гадовых дзяўчат.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я патрабуе мэблі, пледаў і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я патрабуе вясенняга адзення для 37-гадовага мужчыны і хлопцаў ва ўзросце 4 і 6 гадоў ды для 39-гадовай жанчыны.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дзяўчынкі, а таксама пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля), тэл. 712 11 53.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 651 80 20.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Выстава Юрыя Якавенкі

Беластоцкая галерэя „Арсенал" (вул. Міцкевіча, 2) запрашае на выставу прац гродзенскага мастака Юрыя Якавенкі, якая будзе працаваць ад 23 красавіка да 9 мая 2004 г.

Мастак нарадзіўся ў 1965 г. у Прыморскім краі. У 1977-1984 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе па музыцы і выяўленчым мастацтве, а ў 1992 г. закончыў аддзяленне графікі Беларускай акадэміі мастацтва. Ад 1994 г. з'яўляецца сябрам Саюза мастакоў Беларусі, а ад 2001 г. — акадэмікам графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва. Ягоныя працы дэманстраваліся на шаснаццаці айчынных і замежных персанальных выстаўках, між іншым, у Літве, Галандыі, Іспаніі, Бельгіі. Аўтар з'яўляецца лаўрэатам шэрагу ўзнагарод, у тым ліку польскіх. Яго графікі атрымалі вылучэнні на II Міжнародным біенале мініяцюры ў Рацібожы ў 1998 г. і на міжнародных біенале графікі малых памераў у Востраве-Велькапольскім у 1999, 2001 і 2003 гг.

У Беластоку Юрый Якавенка пакажа графіку малых памераў, інспіраваную біблейскімі сюжэтамі. Вернісаж — 23 красавіка 2004 г., гадз. 18. ***(вл)***

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Афарызмы Ладзіка Майніча

Гісторыя

Гісторыя паўтараецца двойчы. Калі яна паўтараецца часьцей, то гэта хвароба.

* * *

Культ асобы заўсёды сьведчыць пра брак культуры.

* * *

Пасьля закону аб люстрацыі ў камуністаў павінны застацца толькі лямпачкі Ільіча.

* * *

Калі прынцы становяцца каралямі, яны часта губляць прынцыповасьць.

* * *

Белыя плямы, чорныя дзіркі, няведамыя старонкі, забытыя імёны — кароткі нарыс нашае гісторыі.

* * *

У мітусьні дзён нараджаюцца міты стагодзьдзяў.

* * *

Гісторыя не прымае ня толькі ўмоўнага, але й разумнага ладу.

* * *

Прафэсійны гісторык К. ня любіць аматараў за тое, што тыя любяць гісторыю.

* * *

Гісторыя — гэта ня тое, што пра яе напісана, а тое, што было.

* * *

Гісторыя — настаўніца жыцьця, але нічому добраму навучыць ня можа.

(правапіс арыгіналу захоўваецца)

Сідар Макацёр

Цімошка

Жыў у Цімохаўцы Цімох.
Жыў сабою, жыў як мог.
Ведаў, лёс такі ў яго,
Рыпацца няма чаго.
Ажно ўсё стала не так,
Прыляцеў унійны грак.
Стук-пук у аконца:
— Цімошка, да сонца!
Насцярожыўся Цімох.
Ну і справа! І ў трыснёг.
Ісці з табою — мне хана,
Адчапіся сатана.
Ад жаху навіслага
Ўбачыў чорта лысага.
Паваліўся Цімох плазам,
Як той навагрудскі блазан,
І галосіць сінім далям:
— Не пяройдзе! Не пазвалям!
Так з прывіднай мроі
Родзяцца героі.

Абвесткі

У Гайнаўцы

Да канца красавіка ў гайнаўскім Музеі і асяродку беларускай культуры можна глядзець мастацкую выстаўку „Колеры Гайнаўшчыны" Станіслава Паскробкі, земляроба з Рыбакоў у Нарваўскай гміне. Запрашаем у гадзінах працы музея.

* * *

30 красавіка г.г. у Гайнаўскім доме культуры па вул. Беластоцкай, 2 адкрыюць выстаўку ручной вышыўкі (гафту), падрыхтаваную юнымі вышывальніцамі з гуртка „Габелен", які працуе пад кіраўніцтвам інструктара пластыкі ў ГДК Зінаіды Якуць. Пачатак а 17 гадзіне. Запрашаем усіх зацікаўленых. **(яц)**

Яднанне па-расійску **Мал. АЛЕГА КАРПОВІЧА**

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Брыжыт Бардо.

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41	42	43	44	45	46	47	48	49	50
51	52	53	54	55	56	57	58	59	60

1. валасяное покрыва ніжняй часткі твару ў мужчын = 40 _ 58 _ 10 _ 11 _ 51 _ 9 _;
2. бізун сплецены з дробных раменьчыкаў = 8 _ 44 _ 55 _;
3. адзінка спадчыннага матэрыялу, якая вызначае фарміраванне элементарнай структуры жывога арганізма = 3 _ 48 _ 12 _;
4. будынак для жылля або размяшчэння ўстаноў = 25 _ 39 _ 37 _;
5. зброя рыцара = 45 _ 43 _ 35 _;
6. вузкая палоска неўзаранай зямлі паміж палеткамі = 59 _ 2 _ 52 _ 7 _;
7. нітка = 17 _ 13 _ 14 _ 15 _;
8. загадчык біблейскага каўчэга = 57 _ 18 _ 6 _;
9. аўтар вершаў = 47 _ 50 _ 5 _ 19 _;
10. плады трапічнай расліны з горкім пякучым смакам і моцным пахам, якія ўжываюцца ў кулінарыі = 21 _ 22 _ 23 _ 24 _ 16 _;
11. сталіца Італіі = 49 _ 56 _ 26 _;
12. установа, якою ў Польшчы кіравалі м.інш. Ярашэвіч і Цімашэвіч = 20 _ 41 _ 42 _ 38 _;
13. няродная, чужая краіна = 29 _ 27 _ 28 _ 30 _ 31 _ 32 _;
14. паўднёваамерыканская дзяржава са сталіцай у Сант'яга = 4 _ 36 _ 1 _ 60 _;
15. паглыбленне ў зямлі, упадзіна, нізіна = 46 _ 33 _ 34 _ 54 _ 53 _;

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 10 нумара

Гайнаўка, Сакі, Валілы, Дубічы, Крушыняны, аўторак.

Рашэнне: **Сакрат Яновіч, Крынкі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Лук'янюку** з Бялкоў і **Валянціне Марціновіч** з Краснага Сяла.

18.04 – 24.04

Баран (21.03. — 19.04.) Твае старанні будуць марныя і нятрапныя. Апазіцыя Марса з Плутонам 24.04. прынясе небяспеку аварыі, узрасце ўзровень агрэсіі. Пазбягай небяспечных месц і безразважных людзей.

Бык (20.04. — 20.05.) Добры час як на інтуітыўныя дзеянні ў інтарэсах, так і рамантычныя рандэву. Запланаў мілы вечар з любай асобай. 23 — 27.04. не старайся атрымаць крэдыт, не пазычай грошай. У справах кар'еры кіруйся інтуіцыяй.

Блізняты (21.05. — 21.06.) 24.04. маланкава аформіш дробныя справы, правядзеш цяжкія размовы. Небяспека сямейных спрэчак. Калі плануеш супольныя мерапрыемствы, рашыся на іх каля 21.04.

Рак (22.06. — 22.07.) Магчымасць апрацаваць новы, доўгатэрміновы план дзейнасці. Каля 20.04. спадзявайся павышэння. Выберыся на прыроду, у недалёкі шлях.

Леў (23.07. — 22.08.) 23 — 27.04. — час на разнародныя навінкі. Будуць з цябе біць фантанам новыя ідэі, без цяжкасцей знойдзеш арыгінальную развязку сваіх праблем. Пі многа мінеральнай вады ды заварак травак. Ільвіцу ўцешыць сексоўная карункавая камбінацыя.

Дзева (23.08. — 22.09.) 19.04. — прыкрыя непаразуменні ды вострыя канфлікты. Маеш цяпер схільнасць заглыбляцца ў сябе, уцёкаў у свет уласных роздумаў, эмоцый і боязі. Любоў можа прынесці больш пакут чым радасці. Свабодныя Дзевы могуць зацікавіцца супрацоўнікам. Твае пазітыўныя адносіны да свету і людзей з'яднаюць прыхільнасць атачэння, што паўплывае на твае самаадчуванне і красу.

Шалі (23.09. — 23.10.) Можна пазайздросціць табе моцнай волі і рашучасці. Калі ты самотны, а нарадзіўся ў дзвюх першых дэкадах знака, можаш разлічваць на знаёмства з кімсьці незвычайным і захапляючым. Не бойся ангажавацца ў новую сувязь, калі нават спачатку можна не здавацца яна быць цікавай і задавальняючай. Могуць адазвацца старыя захворванні.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Не праводзь важных размоў 23 — 24.04., калі будзеш аставацца пад уплывам апазіцыі Плутона да Марса. Пазбягай бравурнай язды і лепш адмоўся ад падарожжа. Неспрыяльнасць у фінансах.

Стралец (22.11. — 21.12.) Не высяляйся з хаты, гэта толькі часовы імпульс! У другой палове красавіка закіпіш аптымізмам, але і будзеш мець шчасце. Асабліва цяжка страціць цяпер лішнія кілаграмы, дык, каб не ўбіцца ў фрустрацыю, не старайся насілу худзець.

Казярог (22.12. — 20.01.) Не бярыся за важныя рашэнні і праз пальцы глядзі на ўсялякія абяцанні. Хопіць табе трываласці і моцнай волі. Да 20.04. пазбягай рызыкоўных сітуацый.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Будзеш моцна ажыўлены, хопіць табе энергіі, зможаш рэалізаваць адважныя праекты. У жыццё закрадзецца шмат замяшання і няўпэўненасці.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Будзеш раздражнены і схільны да рызыкі. Схочаш сканцэнтравацца на адной важнай мэце. Нечакана ўдасца табе памагчы знаёмым у іх праблемах.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960